І-б. "Савецкая Беларусь"
Москва, Моховая, 3 Публичная
библиотека СССР им. Ленина
отд. обмен. адвін экз.

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Krajów, łączcie się! стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

АЎТОРАК
24 лістапада 1931 г.
№ 271 (3360)

Японское войска наступае па ўсім фронце

ЛІГА НАЦЫЙ — ПРЫЛАДА НОВАЙ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ — ДАПАМАГАЕ АКУПАНТАМ ЗАМАЦОЎВАЦЦА Ў МАНЧЖУРЫІ

Японская войска прасьледуе генэр. Ма

БЭЙПІН, 20. Як паведамляюць газэты сёньня адноўлен рух па вузкакалейцы, якая злучае Цыцыкар (Кітай) з горадам Цыцыкарам. «Манчжурское Время» паведамляе, што ў Цыцыкары згрупавана вялікая колькасьць японскіх войск.

Японскія войскі прасьледуюць войска Ма па Кухайскай дарозе (паралельная Цыцыкар-Кухайскай дарозе), маючы на мэце захапіць гэты раён, таксама магчыма і Кухайскую дарогу ў горадзе Хайлуне, пад прыкрыцьцём прасьледаваньня, быццам японскіх войск войскам Ма або барацьбы з бандытамі. Ма пасьпеў правесьці нармальную эвакуацыю маемасьці і снаражэньня, а таксама вывесьці маючыся ў Цыцыкары рухомы склад дарогі. На чале кітайскай адміністрацыі ў Цыцыкары зараз стаіць Чан-Хай-Пэн, часьці якога паступова ўцягваюцца ў Цыцыкар.

Да ваеннае наступленьне японскага імпэрыялізму на Кітай

БЭРЛІН. Як паведамляе карэспандэнт «Дэйчэ альгемэйнэ цэйтунг» з Токіё японскае ваеннае міністэрства падрыхтоўвае новае наступленьне супроць кітайскіх войск. Японская крыніца паведамляюць, паводле слоў карэспандэнта, зьвесткі, што гутарка ідзе аб наступленьні супроць 50000 кітайскіх войск. Японцы быццам баяцца, што Чан-Кай-шы прыбудзе сам на гэты фронт, каб кіраваць апэрацыямі. Японцы думаюць, піша карэспандэнт, —што Чан-Кай-шы мае намер атакаваць пазыцыі японскіх войск з поўдню. Гэтае паведамленьне павінна, відавочна, служыць для таго, каб падрыхтаваць грамадзкую думку да новага наступленьня японскіх войск пад прыкрыцьцём самаабароны.

Генэрал Ма забясьпечыў зброяй — сам японцам

БЭЙПІН. 21-XI. Мясцовая прэса ў Дайрэне засьвярджае, што ён пачаў выкрываць справу транспарту зброі з Дайрэну для кітайцаў у Манчжурыі. Паводле вестак галоўны арганізатар дастаўкі зброі кітайцам — гэта транспартная кантора Кокусэйкуню з вялікай сеткай на мясцовай чыгунцы, мытніцы і іншых транспартных канторах. Зброя пасылалася ў вялікай колькасьці праз Харбін генэралу Ма.

Ваенныя прымаюць меры, каб выратаваць удзельнікаў. Ня выключана магчымасьць, што частка зброі ўзята на ваенных складах.

Імпэратар „раптоўна зьнік"

МУКДЭН. 21-XI. Дырэктар паліцэйскага бюро квантунскага ўраду зрабіў паведамленьне, што былы кітайскі імпэратар Пу-І «раптоўна зьнік» з Цянцзіня ў часе меўшых там месца непарадкаў, відавочна, баючыся за сваё жыцьцё. 13-га лістапада адзначае дырэктар паліцэйскага бюро, Пу-І «нечакана» высадзіўся ў Інькоў, адкуль прыйшла просьба аб прадастаўленьні яму абароны. З гуманістычных меркаваньняў мы парашылі аказаць яму абарону, пасяліўшы яго ў небясьпечным раёне. З тае пары Пу-І знаходзіцца пад нашай абаронай і наш урад не жадае, каб ён быў уцягнуты ў якія-небудзь палітычныя ўскладненьні. З гэтай мэтай мы прымаем меры да таго, каб ён быў пазбаўлены ўсялякай сувязі з вонкавым сьветам.

Трое супроць батючых трамвайшчыка

ВАРШАВА, 22. Паводле даных дырэкцыі варшаўскіх трамвайных паркаў 20 лістапада ня выйшла на работу 645 трамвайшчыкаў, у тым ліку 4.00 рабочых рамонтных майстэрняў. Незьявіўшыяся ў тэрмін—патрабаваны ва ўмовы ўноў паступаючых. Такім чынам дырэкцыя жадае зрабіць «адсеў» «западозраных элемэнтаў». Шмат батычыць «нуда ненадзейных», у прыватнасьці, абраных на мітынгу дэлегатамі, дык «ім прапанавана не затрудняць сябе» падачай заяў.

Агульны сход рабочых тэхнічнага аддзелу Варшаўскага магістрату патрабуе спыненьня рэпрэсій супроць баставаўшых трамвайшчыкаў.

Японцы ў дарозе на вайны на поўным ходзе

ВАРШАВА, 23. Зараз-жа пасьля ўвядзеньня закону аб мілітарызацыі чыгунак польскі ўрад падрыхтоўвае законапраэкт аб мілітарызацыі пошты і тэлеграфу.

„Стары знаёмы"

У Варшаве, Львове, Вільне зноў
Ідуць яўрэйскія пагромы...
Зноў груганьне ляціць на кроў,
І паўстае зноў твар знаёмы:

Вядомы спэц пагромных спраў
Бандыт крывавы Балаховіч...
Груган стары заклепатаў
Крыві працоўных прагне сволач.

Ён марыць запаліць агонь
І заклікае ў бой сярдзіта...
Куды ляціш ты борзы конь?
Дзе зложыш ты свае капыты?

Фашыстка банды нападаюць на сходы рабочых

БЭРЛІН, 22-XI. Учора ў Аахене (Зах. Нямеччына) на сходзе скліканым нацыянал-сацыялістамі (фашыстамі) ад былася буйная сутычка паміж рэвалюцыйнымі рабочымі і фашыстамі. Паліцыя распусьціла сход. Сутычкі працягваліся і на вуліцы. Адзін фашыст забіты, шмат раненых, цэлы рад рабочых арыштавана.

***

БЭРЛІН, 22. Рашэньне арбітражнай камісіі аб скарачэньні зарплаты партовым рабочым Дуісбурга на 5 з палоўвай проц. прызнана ўчора абавязковым. Буржуазны друк напамінае ў сувязі з гэтым рэфармісцкім прафсаюзам аб іх абавязку заклікаць бастуючых рабочых да аднаўленьня работы.

Рэч ад СССР і кітайскіх саветаў

ПАРЫЖ. 22-XI. «Юманітэ» паведамляе, што парыскі камітэт французкай кампартыі склікае на 1-га сьнежня масавы мітынг супроць вайны на Далёкім Усходзе і за абарону СССР. Ад быўся рад сходаў, скліканых «таварыствам прыхільнікаў СССР» прысьвечаных барацьбе супроць ваеннай небясьпекі, абароне СССР і кітайскіх саветаў.

Камісія падзелу Кітаю

ПАРЫЖ. 22-XI. Камантуючы рашэньне савету Лігі нацый аб насыланьні ў Кітай «камісіі для вывучэньня становішча на месцы», увесь буржуазны друк выказвае надзвычайнае задаволеньне і бачыць у гэтым рашэньні пачатак «суціхаміраньня».

Адбіваючы, як відаць, настрой французкага міністэрства замежных спраў, друк вітае Японію, «дапамагаючую Лізе нацый выбрацца з тупіка».

Закрутыпераломузагатоўках

Выкананьне загатоўчых плянаў і ў першую чаргу такіх важнейшых галін загатовак як збожжа, лёна-валакно, мяса і экспартная сыравіна,—зьяўляецца важнейшай, адказьнейшай задачай усіх партыйных, савецкіх, каапэрацыйных, калгасных і саўгасных арганізацый. Ад выкананьня гэтай задачы ў значнай ступені будзе залежыць посьпех барацьбы за выкананьне ўсяго народна-гаспадарчага пляну 4 квартału трэцяга рашаючага году і чацьвертага заключнага году пяцігодкі. Ліста пад зьяўляецца рашаючым месяцам у выкананьні загатоўчых плянаў. Партыйныя арганізацыі абавязаны былі мабілізаваць усе сілы, мабілізаваць усё магчымае для таго, каб забясьпечыць рашаючую перамогу на фронце загатовак.

Аднак, па 21 лістапада малюнак выкананьня важнейшых відаў загатовак далёка незадавальняючы. Плян збожжазагатовак выкананы на 57,3 проц., па лёна-валакне—на 7,8, а па пянькі—толькі 0,9 проц., у хвасьце пігнуцца такія рабы, як Лельчыцкі, які плян збожжазагатовак выкапаў на 27 проц., Старадарожскі—на 22, Прапойскі—39 проц.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які нядаўна скончыў сваю работу, па-бальшавіцку выкрыў усе прычыны такіх ганебных тэмпаў у ходзе загатовак. «Адставаньне ў загатоўках —гаворыцца ў рэзалюцыі ЦК,— тлумачыцца тым, што цэлы рад партарганізацый савецкіх загатоўчых органаў, саўгасныя і калгасныя сыстэмы не арганізавалі па-бальшавіцку справу загатовак, прадаставілі яе самацёку» «Некаторыя партарганізацыі замест руйнуючага ўдару па кулаку і яго агентуры—правых і «левых» апартуністах, замест рашучай барацьбы са стаўкай кулака на зрыў загатовак, замест выкрыцьця яго новай тактыкі ў барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту (імкненьне ўвайсьці ў калгасы і разбурыць з сярэдзіны, распальваньне спажывецкіх і рвацкіх тэндэнцый сяод адсталых груп калгасьнікаў, скарыстаньне гэтых калгасьнікаў у якасьці сваёй агентуры і г. д.), дапусьцілі процінастаўленьне з боку асобных работнікаў і калгасаў мясцовых інтарэсаў інтарэсам пралетарскай дзяржавы, што адбівае антыпартыйную, кулацкую ідэалёгію і практыку». (З рэзалюцыі аб'яднан. пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Абсалютная правільнасьць вышэйсказанага пацьвярджаецца тымі матэрыяламі, якія штодзённа палаюцца на старонках нашай газэты. Чым як ня кулацкімі тэндэнцыямі, як не процінастаўленьнем сваіх мясцовых інтарэсаў інтарэсам пралетарскай дзяржавы зьяўляецца выступленьне старшыні калгасу імя Сталіна № 1, Полацкага раёну, Дзюбанава, які аб выкананьні пляну збожжазагатовак так заяўляе: «Злай ім збожжа, а пасьля прасі зьняўшы шапку». Чым як ня самым адкрытым выступленьнем кулацкага агента зьяўляецца выступленьне старшыні калгасу «Шлях сацыялізму», таго-ж Полацкага раёну, Шлейвіса, які на запатрабаваньне лепшых калгасьнікаў-ударнікаў аб тым, каб калгас у першую чаргу выканаў абавязкі перад дзяржавай, адказвае: «Менш вы зьвяртайце ўвагі на выкананьне гэтых загатовак».

Гэтыя два старшыні калгасаў самым яскравым чынам адбіваюць кулацкія імкненьні затрымаць збожжа на месцы і гэтым сарваць пасьпяховае правядзеньне збожжазагатовак. І горш за ўсё тое, што «асобныя работнікі страцілі клясавую пільнасьць, не зразумелі таго, што ў калгасах толькі па чынаецца перавыхаваньне селяніна на данай стадыі калгаснага руху ў яго арцельнай форме, а не завяршаецца, ня ўлічылі наяўнасьці элемэнтаў клясавай барацьбы ў калгасах» з прычыны таго кулацкія выступленьні, кулацкая практыка асобных калгасаў далёка ня ўсюды сустракае належны бальшавіцкі адпор з боку партыйных ячэек.

Разгортваньне масавай выхаваўчай работы вакол загатовак ня гледзячы на неадпаразовыя катэгарычныя дырэктывы ЦК КП(б)Б,—на мясцох усё яшчэ ігнаруецца, а ў радзе раёнаў ірроста палмяняецца адміністраваньнем, «ляпкай» практыкай у адносінах сераднякоў.

Значным тормазам у справе своечасовага выкананьня загатоўчых плянаў зьяўляецца нягібкасьць загатоўчага апарату, засьмечанасьць асобных яго зьвеньняў чужым элемэнтам, фармальна-бюракратычныя адносіны значнай часткі работнікаў да выкананьня сваіх абавязкаў.

Толькі ў выніку засьмечанасьці апарату, толькі ў выніку недапушчальных адносін да работы мог адарыцца такі факт, калі ў Полацкім раёне арганізаваны калгасам «Беларуская Вёска» чырвоны абоз вандраваў цэлы дзень, прычым Палатаўская база і Юраўвіцкае сельспажыўтаварыства адмаўляліся прыняць збожжа, і чырвоны абоз змушаны быў вярнуцца назад у калгас. Такія факты неадзінкавыя.

Яшчэ горш абстаіць справа з загатоўкамі лёна-валакна. 7,8 проц. выкананьня пляну загатовак сьведчаць аб тым, што вурокі мінулага году ня ўлічаны, што большасьць раённых партыйных арганізацый ня зволелі выкарыстаць тыя спрыяючыя ўмовы, якія мы маем у гэтым годзе ў выніку посьпехаў, атрыманых намі ў галіне пасеву і своечасовай уборкі лёну і на капель.

Ні ў якім разе ня можа быць цярпімым такое становішча, калі лён у калгасах і саўгасах ляжыць неапрацаваны, калі склады асобных райсаюзаў завалены валакном, а наша сапыялістычная прамысловасьць адчувае вострую патрэбу ў сыравіне. Такое становішча атрымалася таму, што большасьць калгасаў і саўгасаў не сканцэнтравала ўвагі калгасьнікаў на своечасовую апрацоўку лёну, а загатоўчы апарат не зьвяртае ўвагі на тое, каб не затрымліваць валакна ў сябе на складах. Ня лепш абстаіць справа з выкананьнем пляну мясазагатовак і экспартнай сыравіны.

Трэба з усёй рашучасьцю палкрэсьліць, што ў радзе раёнаў не разумеюць таго, што выкананьне загатоўчых плянаў знаходзіцца ў цеснай сувязі з работай па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, што недаацэнка работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў ёсьць зрыў работы па загатоўках.

Пленум ЦК і ЦКК у сваёй рэзалюцыі аб загатоўках, якую мы сёньня друкуем, рашуча патрабуе ад партыйных арганізацый, каб у бліжэйшыя дні быў створаны рашучы пералом у ходзе загатовак, які-б забясьпечыў поўнае выкананьне загатоўчых плянаў у бліжэйшы час. «Рабочая кляса, ажыцьцяўляючы кіраўніцтва сацыялістычнай перабудовай вёскі, аказваючы вялізарнейшую тэхнічную, фінансавую і інш. матар'яльную і арганізацыйную дапамогу сялянству і асабліва калгасам—мае права патрабаваць выкананьня калгасамі іх абавязкаў перад дзяржавай» (З рэз. пленуму).

Партарганізацыі абавязаны неадкладна арганізаваць шырокую распрацоўку рашэньняў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК з тым, каб мабілізаваць усіх партыйцаў, усіх рабочых і калгасьнікаў на выкананьне чарговых задач, пастаўленых пленумам. Арганізацыяй чырвоных абозаў, поўным выкананьнем сваіх абавязкаў перад дзяржавай павінны адказаць калгасы і саўгасы на пастановы пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б. Толькі рашучая, бязьлітасная барацьба з кулацкімі месьцішкімі тэндэнцыямі, толькі бязьлітасная барацьба на два фронты, на аснове разгорнутай масавай работы спрод калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў-адпаасобнікаў, забясьпечыць выкананьне загатоўчых плянаў у бліжэйшы час.

Права-атарскі-падпальшчыкі антысавецкай вайны злоўлены за руку

Хлусьня—спосаб апраўданьня акупацыі Манчжуры

МУКДЭН, 22-XI. Сёньня раніцою ад былася нарада прадстаўнікоў замежнага друку сумесна з прадстаўніком штабу і камандуючага японскай акупацыйнай арміяй у Манчжуры Хондзіо.

Надзвычайную сэнсацыю выклікала пытаньне чужаземных карэспандэнтаў аб тым, якім чынам тлумачыць прадстаўнік генэрала Хондзіо адказ японскага ўраду на ноту Літвінава. У гэтым адказе японскі ўрад заяўляе, што ён не дае веры розным чуткам аб дапамозе, аказваемай савецкім урадам якому-б то ні было кітайскаму войску і што «ён катэгарычна заяўляе, што ня можа быць і гутаркі аб тым, што японскае консульства і вайсковая ўлада здымляюць чуткі і распаўсюджваюць іх праз друк і тэлеграфныя агенцтвы».

Чужаземныя карэспандэнты, асабліва карэспандэнты «Нью-Ёрк-таймс» і «Юнайтэд прэс» зазначылі, што заява японскага ўраду стаіць іх у становішча тупоў паколькі яны паведамілі за мяжу аб катэгарычных заявах ня, ня Хондзіо адносна дапамогі, якую нібыта аказвае савецкі ўрад генэралу Ма.

На нарадзе высьветлілася, што 13 лістапада, а 6 гадзіне ўвечары, карэспандэнт «Нью-Ёрк таймс» гутарыў з генэралам Хондзіо, прычым Хондзіо заявіў, што зядомая дзяржава «ўзяла ня супрацьўлясьласьць Кітаю». Карэспандэнт сьцьвярджае, што Хондзіо гаварыў аб тым, што ў кітайскага войска зьявіліся эфэктныя гарматы і а на даўнага часу заўважаецца і палепшаньне стралкіны кітайскай артылерыі і ўжываньне новых мэтадаў тактыкі і г. д. Апроч таго,—заяўляе карэспандэнт,—Хондзіо дадаў: «з прыбыцьцём у Паўночную Манчжурыю кітайскіх і карэйскіх членаў трэцяй інтэрнацыянальнай арміі, у Манчжурскай абстаноўцы зьявіліся новыя элемэнты вялікага ваеннага і палітычнага значэньня, элемэнты, якія відавочна распаўсюджваюцца па ўсім Кітаі і якія ні Японія, ні іншыя краіны ня могуць ігнараваць».

Паводле слоў таго-ж карэспандэнта, 12 лістапада ў гутарцы, якая адбылася ў цягніку па шляху з Харбіну ў Чанчун, японскі генэральны консул у Харбіне Охасі даў шмат вестак, у тым ліку наступныя: «Нагнядаецца ня лікі наплыў з Сібіру кітайскіх і карэйскіх камуністаў з салецкіх армій». Паводле паведамленьняў, якія атрыманы ад японскага консула ў Цыцыкары «11 лістапада для генэрала Ма прыбыло з Манчжуры 2 танкі і 6 шасьці цалёвых гарматаў». Японцы перахапілі пярэданае на провалу распараджэньне Чан-Суэ-ляна, у якім ён раіў генэралу Ма адхіляцца ў будучым ад гэтага (г. зн. ад «дапамогі» савецкага ўраду).

«Савецкія вайсковыя школы па падрыхтоўцы кітайскіх афіцэраў, якія знаходзяцца ля Ўладзівастоку, маюць у сваім сьпісу 200 кітайскіх калэтаў-камуністаў. Гэтыя школы цяпер фактычна пустуюць таму, што тыя, якія навучаюцца, далучыліся, цапэўна, да войска генэрала Ма». Пасьля гэтых паведамленьняў, карэспандэнт Осакі падае тэкст тэлеграмы, якая пасланa карэспандэнтам сваёй газэце.

Апроч таго, на нарадзе высьветлілася, што карэспандэнт «Юнайтэд прэс» атрымаў ад Хондзіо гэткія-ж паведамленьні, як і карэспандэнт «Нью-Ёрк-таймс» Толькі на гэты раз Хондзіо ўпамянуў «Трэцюю Чырвоную армію» замест «Трэцяй інтэрнацыянальнай арміі».

Да гэтага можна яшчэ дадаць паведамленьні прадстаўнікоў ад ваенай улады ад 12-XI аб прыбыцьці карэйскіх і кітайскіх камуністаў з Благавешчэнску і аб прыбыцьці на ст. Апанасі з заводу 12 вагонаў з грузам баявых прыпасаў і зброі».

Камэнтуючы абвяржэньне паведамленьняў аб дапамозе, якая аказваецца савецкім урадам генэралу Ма, адносіцца да пэрыяду баёў на фронце Ананьцьдзі, г. зн. у пачатку лістапада. Магчыма,—працягвае прадстаўнік.—Хондзіо, што забясьпечаньне зброяй з боку СССР мела месца да паказаных баёў». Аднак, прадстаўнік генэрала Хондзіо дадаў, што гэта яго асабістая думка і што ён высьветліць гэтае пытаньне і сёньня-ж дасьць афіцыйны адказ.

Што робіцца ў калгасе „Камвуз Беларусі"

Кулакі, былыя ўраднікі і паліцэйскія разбураюць гаспадарку

Калгас «Камвуз Беларусі», Пухавіцкага раёну, арганізаваўся яшчэ ў 1929 г з 15-ці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Зараз у калгасе налічваецца больш за 70.

Здавалася-б, што такі стары калгас павінен стаць прыкладам для іншых, паказаць узоры бальшавіцкай працы, бо да ўсяго гэтага былі і ёсьць усе магчымасьці. Але той, хто ішоў у калгас з пэўнаю мэтаю, які лічыў яго пабочным для сябе заработкам,—паказаў свае ворожыя аблічча. І тое што ёсьць зараз вымушае нас з усёй рашучасьцю біць трывогу, даць мову фактам.

У леташнім годзе калгас пачаў будавацца стайню, сяк-так накрылі яе і меліся паставіць коні, а потым агледзеліся, што няма дзе складаць збожжа і занялі яе снапамі Коні засталіся бяз прытулку, то на двары, то пад страхою, як дзе папала. Праз невялікі час ветрам зламала страху. Шмат давялося прыкласьці працы, каб выцягнуць адтуль усё збожжа. Страху за зіму расьцягалі, не засталося аніводнай паплеціны—спалілі. А колькі затрачана было сродкаў, працоўнага часу?

Усю зіму, вясну і лета пятрэў голы зруб пад дажджом і сьнегам. Нікому і ў галаву ня прыйшло, каб зноў пачаць крыць яе. Толькі апошнім часам узяліся за скончэньне.

Усе коні заганяюцца як авечкі разам з жарабцамі ў адзін халодны ток, калечаць адзін аднаму ногі, выбіваюць зубы і г. д. Ніхто не зварочвае на гэта ўвагі.

Сельска-гаспадарчыя машыны валяюцца на двары дзе ходзіць розная жывёла Меліся выпадкі, што коні і каровы прабівалі сабе ногі. Ніхто ня думае, што трэба іх спрытоніць, прывесьці ў парадак. Жыняркі, касаркі, грабалкі валяюцца таксама дзе папала.

Нават такія каштоўныя малацавыя машыны, як вальцы, барабаны і іншыя часткі пытлёўкі—паўрасталі ў зямлю і за іх прывязваюць на ноч коняй.

Старшыня калгасу, партыец Сарока ня цікавіцца працаю гаспадаркі. Даходзіла да таго, што ён пакідаў калгас і на цэлых два тыдні ехаў няма ведама куды ў нейкія госьці, матывуючы тым, што нібы хворая была жонка. Рэшта членаў праўленьня таксама апартуністычна адносяцца да абавязкаў; толькі тое і робяць, што вядуць заўзятыя паміж сабою спрэчкі.

Калгас «Камвуз Беларусі» засьмечаны кулацкімі элемэнтамі палітычнашкодным людзьмі

Жонка лішэнца, былога паліцэйскага Пятровіча, да працы адносіцца пакаёшнаму. У большасьці выпадкаў ходзіць на працу сам Пятровіч, які кажа, што працуе нібы за сваю жонку.

«Як-жа кажа былы старшыня калгасу Чарніцкі—хіба мы ня ведаем, што ён свой чалавек? Няхай працуе» Так і выходзіць, працуе як яму падабаецца

Жонка ўраднікa Крывіцкага таксама калгасьніца. На працу ня кодзіць, а чакае пайка Крывіцкі—ураднік былой Дудзіцкай воласьці, рэзаў нагайкаю цяперашніх калгасьнікаў

Жонка паліцэйскага Хадыкі—калгасьніца, была пакінула калгас, прадала карову і рэшту маемасьці, з поўным зноў вярнулася... прычылі. «—Што-ж, бедная»—кажуць члены праўленьня і прызначылі яе кухаркаю.

Служыцель духоўнага культу Крыўчык С. да 1929 году быў дзяком—зараз калгасьнік і знаёмы займаецца шкодніцтвам. У веснавую пасеўную кампанію за адзін дзень ён «выпрацоўваў» пяць дзён. І ўрэшце вышла тое, што большая частка поля дзе ён сеяў,—была пустою. Гэта справа перадана ў суд. Калгасьнікі шмат разоў узьнімалі пытаньне аб выключэньні Крыўчыка з калгасу, але праўленьне «прыпае да ведама», а шкодніцтва паглыбляецца.

У складзе праўленьня гапаровае месца займаюць цьвёрдазаданьнікі і індывідуальна абкладзеныя. Загадчык гаспадаркі Тамэла—кулак, быў індывідуальна абкладзеныя.

Дык на дзіва, што той самы Чарнецкі, былы старшыня калгасу, растраціў 800 руб., не разьлічыўся з калгасьнікамі за 1930 г. і ня гледзячы на пастанову агульнага сходу:—папоўніць растрату ў тыдневы тэрмін і да гэтага часу грошай ня ўнёс; а калгасьнікі чакаюць разьліку.

Зараз калгас да разьмеркаваньня ўраджаю таксама не падрыхтаваны, бо ня ведае колькі чаго мае гаспадарка: толькі цяпер яшчэ пачынаецца малацьба. Сталых брыгад у калгасе няма. Абмалочанае за дзень збожжа, раскідана на ўсіх такох, пакідаецца незамкнёным, ёсьць выпадкі кражы апошняга.

Калгасьнікі апынуліся ў «зачараваным крузе», ніхто ня ведае добра колькі ён зарабіў і колькі давядзецца атрымаць за працу. Такое становішча прыяло да таго, што калгасьнікі, бывае, ня выходзяць на працу. Ні праўленьне, ні сельсавет ніякага зруху ў гэтым ня робяць.

Становішча з кормам—пагражаючае: большая частка канюшыны ўжо скормлена а рэшта загінула ў сьціртах на полі. Другі ўкос застаўся зімаваць на ніі. Фуражныя фонды ня складзены. Безгаспадарчасьць, абязьлічка і кулацка-шкодніцкія элемэнты—заядаюць гаспадарку.

Кулак Пяткевіч (а такіх ня мала ёсьць у калгасе), які на першы погляд здавалася-б працуе, на самай справе—вядзе агітацыю супроць калгасу.

Сельсавет ня кіруе працаю калгасу, ён займаецца дутымі лічбамі калектывізацыі. «Калі ёсьць 40 проц.,—кажа—старшыня сельсавету—сьмела піша 50 проц., бо наш раён і так па ўсім цягнецца ў хвасьце».

Такіх разважаньняў ёсьць шмат. Члены сельсавету, прыкладам, Макась ды іншыя, яўна патураюць кулаком. Былі выпадкі, калі яны адмаўляліся рабіць опісь гаспадаркі кулака Сквярнюка.

Такім зьявішчам у Дудзіцкім сельсавеце—трэба паклясьці рашучы канец. Праўленьне калгасу таксама трэба перагледзець і папоўніць сапраўднымі ўдарнікамі, якія-б здолелі кіраваць буйнаю гаспадаркою.

Ул.

Кулацкі агент Шэлег задавальняе „свае патрэбы"

Разьмеркаваньне ўраджаю і прыбытку ў калгасах Рудзенскага сельсавету, Пухавіцкага раёну, праходзіць габінэтным парадкам, бяз удзелу шырокіх калгасных мас. Цыркулярны Наркамзему і Калгасцэнтру БССР не распрацаваны на сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў. У выніку ў калгасе «Вясёлае жыцьцё» разьмеркавалі бульбу не па колькасьці вырпрацаваных кожным калгасьнікам працадзён, а па едаках. Пасьля такога разьмеркаваньня калгас «Вясёлае жыцьцё» ніводнага кілё бульбы дзяржаве ня здаў. Старшыня калгасу Шэлег заявіў, што ніводнага кілёграма бульбы дзяржаве не дамо, а здаволім свае патрэбы». Такія кулацка-спажывецкія настроі маюць месца і ў калгасах «Чырвоны спэцыяліст» і «Новы шлях». Гэтым кулацка-спажывецкім настроям не дана рашучага адпору з боку партыйных і салецкіх арганізацый.

Р. Асаха.

Даць волакно тэкстыльпромысловасьці

Арганізаваць лёнакомбінат фабрыкі „Дзьвіна" і імя Карла Маркса з-за адсутнасьці ваг на нагружаны на 30 проц., 50 проц. загатоўленага валакна ляжыць на складах райспажыўсаюзаў

Тэкстыльаб'яднаньне ў баку ад лёназагатовак

Беларускае кіраўніцтва базамі Тэкстыльаб'яднаньня, якое зьяўляецца та стаўшчыком сыравіны для тэкстыльнай прамысловасьці БССР, не праявіла рашучых захадаў у справе загатовак лёнавалакна

Фабрыка «Дзьвіна» (Віцебскі), Аршанскі лёнакамбінат і фабрыка імя К. Маркса (Лёзьненскі раён) з прычыны адсутнасьці лёна-валакна нагружаны работай толькі на 30 проц. Да 15 лістапада Беларускае кіраўніцтва Тэкстыльаб'яднаньня павінна было мець 31.000тон валакна, фактычна загатоўлена толькі 1.587 тон.

Апроч лёна-валакна, тэкстыльная прамысловасьць БССР павінна была атрымаць 2.300 тон пянькі, апошняй загатоўлена толькі 2 тоны, а фабрыкі не атрымалі ніводнага цэнтнера.

Больш таго, з паказанай колькасьці валакна і пянькі больш 50 проц. ляжыць на складах райспажыўсаюзу, і с мельскі, Мазырскі і Крупскі райспажыўсаюзы не прыступілі да адпраўкі загатоўленага валакна па нарадзе.

Якасьць загатоўленага валакна вельмі нізкая, напалову з кастрыцай. З 50 тон валакна загатоўленага ў Крупскім раёне, толькі 10 тон аказалася здавальняючай якасьці.

МТС праяўляюць поўную бязьдзейнасьць у справе загатовак лёна-валакна. Па дагаворанасьці Трактарацэнтру з Белтэкстыльтрэстам, МТС павінны далі даць 360 тон валакна, а фактычна здана толькі 2,5 тоны валакна. МТС паўнны зараз-жа рашуча прыступіць да апрацоўкі лёна-валакна і цалкам выканаць узятыя на сябе абавязкі на здачы валакна і пянькі тэкстыльнай прамысловасьці.

А. М.

СПЫНІЦЬ ЗДАЧУ МОКРАЙ ТРАСТЫ

Полацак. (Наш кар.). Шмат разоў калгасы папярэджаліся аб неабходнасьці сартаваць трасту, аднак, ня гледзячы на гэта на лёназавод прывозяць трасту зусім ніжэйшай якасьці, мокрую і несартаваную. З гэтай прычыны трасту часта ня прымаюць.

Нядбайна адносяцца да загатовак трасты калгасы Гарадоцкага і Бабыніцкага сельсаветаў. Калгасы імя Фрунзэ, «Камінтэрн», імя Мялешкі, «Прагрэс», «Труд» і імя Крупскай прывезьлі на Ветрынскі лёназавод 1,5 тоны мокрай трасты. Калі адміністрацыя лёназаводу адмовілася прыняць мокрую трасту, дык калгасьнікі расставілі яе сушыць каля заводу, а зараз зусім забыліся пра яе. Ужо прайшло, 20 дзён, а траста ўсё ляжыць і мокне каля заводу.

Я. Зорны.

По ачч на ня ўк ючылоса ў месячнік лёназагатовкі

Траста не паднята, лёнамялкі не нагружаны

Полацак. (Наш. кор.). Полацкі раён зьяўляецца адным з лёназодных раёнаў БССР. Сёлета па раёне было засеяна 5.600 га лёну. Аднак, на апрацоўку лёну ў раёне заварачваецца мала ўвагі. Масавая апрацоўка лёну яшчэ не пачалася. У сувязі з гэтым тармозяцца лёназагатоўкі. На 15 лістапада загатоўкі семя выкананы на 26,5 проц., лёна-валакна—0,8 проц. Не арганізавана належным чынам здача трасты на лёназаводы (31 проц. заданьня).

Рад калгасаў ганебна адстаюць у справе лёнаапрацовак. Калгас імя Дзяржынскага, Ушлікоўскага сельсавету, імя Карла Маркса, Закарскага сельсавету, «Прагрэс», Бабыніцкага сельсавету, амаль не пачалі здачу (продаж) лёна-валакна. У гэтых калгасах лёна-мялкі поўнасьцю не нагружаны. Траста ня ўсюды паднята са сьцелішчаў.

У калгасах імя Леніна, Надкага сельсавету, імя Крупскай, Шпакоўшчынскага сельсавету, не арганізаваны брыгады трапальшчыкаў. У калгасе імя Леніна ня ўся траста паднята, але і тая, якая паднята, ляжыць раскіданай на полі. Апроч таго, значная частка трасты ляжыць на сьцелішчах у вазе, але калгас не сьцяшаецца падніць яе.

У калгасах дзейнасьці Ветрынскай МТС больш 30 проц. трасты стаіць у кучках і псуецца.

Некаторыя калгасы раёну выяўляюць тэндэнцыі адкласьці апрацоўку лёну на зіму. Адзін з буйных калгасаў раёну імя Дзяржынскага, які сёлета засеяў 84 га лёну, палаўся кулацкай агітацыі і мяркуе адкласьці апрацоўку лёну трасты з 40 га на будучы год.

Між тым, да апошняга часу калгас ня здаў ніводнага кілё лёна-валакна цват па кантрактацыйных дагаворах.

Калгасы Пушлікоўскага і Замшанскага сельсавету не закончылі абмалоту лёну Калгас імя Сталіна, МалаСітнянскага сельсавету, чакае малатарні для абмалоту лёну.

Там, дзе вакол лёназагатовак мабілізавана грамадзкая думка, дзе агітацыі клясавага ворага даны рашучы адпор—там лёназагатоўк праходзяць больш пасьпяхова. Здавальняючы праходзіць апрацоўка і здача лёну у калгасах Баяцкага сельсавету. Калгас «Гігант» і «Новае жыцьцё» амаль цалкам закончылі апрацоўку лёна-валакна. Калгасы «Шлях Сталіна», «Заклік Сталіна» і «Палац працы», Вельскага сельсавету, яшчэ да і лістапада выканалі плян здачы семя і па-бальшавіцку змагаюцца за апрацоўку лёна-валакна.

Адстаючым калгасам Полаччыны трэба раўнацца на перадавых. Шляхам мабілізацыі ўвагі калгасьнікаў шляхам узмацненьня кіраўніцтва кодам апрацоўкі лёнавалакна, трэба дамагчыся поўнага выкананьня плянаў загатовак лёну на працягу сьнежня гэтага году.

Я. Зорны.

Варашылаўцы па-бальшавіцку змагаюцца за апрацоўку лёну

Узяць на грамадзкі буксір калгас „Перамога"

ЛЕПЕЛЬ (Белта). Калгас імя Варашылава ўключыўся ў месячнік апрацоўкі лёну і здачы (продажу) лёна-валакна дзяржаве. Калгасьнікі пабаяному ўзяліся за работу. Паміж кожнай брыгадай мільшчыкаў і трапальшчыкаў разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, наладжана бесьперапынная сутачная работа, лёнамялкі нагружаны поўнасьцю.

На працягу сутак брыгада на аднэй лёнамялцы апрацоўвае 2,2 цнт. лёна-валакна. На 20 лістапада калгас здаў (прадаў) дзяржаве 1,5 тоны лёна-валакна.

Зусім інакш праводзіцца работа па апрацоўцы лёну ў калгасе «Перамога». Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ня ўжываюцца, апрацоўка лёну адстае. Трохвальная мялка не скарыстоўваецца. Прымеценая 6-вальная мялка з калгасу імя Варашылава—3 дні прастаяла без работы, а зараз замест 2,5 цнт. валакна ў суткі выпрацоўвае толькі 0,4 цнт.

Калгас імя Варашылава павінен узяць на грамадзкі буксір калгас «

За „Чырвоную кнігу саветаў“

СЁНЬНЯ РАПАРТУЮЦЬ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ:

■ ВІЦЕБСКІ ГАРСАВЕТ,
■ БАБРУЙСКІ ГАРСАВЕТ,
■ ДЭПУТАЦКАЯ ГРУПА ЧЫРВОНАШТАНДАРНАГА ЗАВОДУ „КАМУНАР“

АБ ПЕРШЫХ ПЕРАМОГА У ВЫКАНАНЬНІ ПРАГРАМЫ--МІНІМУМУ

Першыя вынікі барацьбы за месца ў „Чырвонай кнізе“

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта)

Бабруйскі гарадзкі савет першым з усіх гарсаветаў Беларусі ўключыўся ў сацыялістычнае спаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартаў саветаў», узяўшы на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па перабудове сваёй масавай работы па ўзмацненьні работы сэкцый і дэпутацкіх груп на прадпрыемствах, па рэалізацыі дырэктыў ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ у галіне прыцягненьня працоўных да работы саветаў.

Асноўным недахватам масавае работы гарадзкога савету, выяўлялася тое, што гарадзкі савет ня здолеў абкружыць сябе шырокім актывам з лепшых ударнікаў вытворчасьці а праз гэта і ня меў цеснае сувязі з прадпрыемствамі, ня мог ахопіць усёй работы.

За час праводзьненьня справаздачнай кампаніі гарсавет дабіўся прыліву новых 700 ударнікаў у склад членаў сэкцый гарадзкога савету спэцыялістаў. За гэты час уцягнута іх 65.

Практычнай рэалізацыяй дырэктыў партыі і вышэйшых прафорганаў аб ажыўленьні масавай работы гарадзкога савету зьявілася карэнная перабудова самой структуры работы сэкцыяй. Арганізаваны новыя сэкцыі: транспарту і сувязі, аргмасавазая і грамадзкага харчаваньня. Праца сэкцый праводзіцца выключна брыгадным мэтадам, што дае чоткае разьмеркаваньне работы, лепшы яе вучот, большую зацікаўленасьць і большую адказнасьць у рабоце з боку асобных брыгад і брыгадзіраў. Гэта дало і ліквідацыю абязьлічкі, якая панавала ў рабоце сэкцый да апошняга часу.

Вялікая ўвага аддадзена разгортваньню сацыялістычнага сумяшчаньня. Да часу ўключэньня ў спаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе» гэта работа была надзвычайна адсталым участкам работы Бабруйскага гарадзкога савету. Сацнамесьнікаў праўда, было вылучана багата, але працавала з іх толькі 2-3. У сучасны момант праведзена карэнная перабудова гэтай работы. Старшыні сэкцый зьяўляюцца сацнамесьнікамі аддзелых кіраўнікоў асобных галін работы, блізкіх да галіны работы сэкцый. Колькасьць сацнамесьнікаў даведзена да 47.

Чарговымі задачамі гарадзкога савету ў справе перабудовы сваёй масавай работы зьяўляецца паляпшэньне работы дэпутацкіх груп на прадпрыемствах. Арганізацыя цэхавых дэпутацкіх груп, якая праводзіцца ў сучасны момант, павінна быць забясьпечана належным штодзённым кіраўніцтвам з боку гарадзкога савету і яго сэкцый.

А. Дамброўскі.

Віцебскі гарсавет зможа далейшым разгортваньнем сацспаборніцтва дабіцца месца ў „Чырвонай кнізе“

Віцебскі Гарсавет уключыўся ў сацспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў». У аснову сваёй барацьбы за месца ў «Чырвонай кнізе» Гарсавет паклаў «праграму-мінімум» і зараз падводзіць вэўныя вынікі сваёй работы ў гэтай галіне.

Фінплян гарсаветам за кастрычнік месяц выкананы на 105 проц., а да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі гарсавет дабіўся 53 проц. выкананьня фінпляну IV кварталу.

У галіне ўсеагульнага навучаньня на базе сямігодкі гарсавет дабіўся поўнага ахопу школай усіх дзяцей школьнага ўзросту як па горадзе, так і па вакольных сельсаветах. Вучні забясьпечаны абуткам і гарачымі сьведкамі, 100 проц. нашэсьменных з працоўнага насельніцтва ахоплены лікпунктамі. У выніку гэтага Віцебск у хуткім часе можа стаць горадам суцэльнай пісьменнасьці.

Гарсаветам наладжана жывое апэрацыйнае кіраўніцтва работай дэпутацкіх груп на прадпрыемствах. Дэпутацкія групы на некаторых прадпрыемствах гораду ўжо дабіліся пэўных вынікаў сваёй работы. Так, дэпутацкія групы на фабрыках «Прафінтэрн», імя Лекерта і інструментальнай фабрыцы значна дапамаглі заводзкім арганізацыям у правядзеньні фінэстафэты. Дэпутаткая група фабрыкі «Прафінтэрн» дабілася выкананьня прамфінпляну. Зараз гарсавет узяўся за арганізацыю дэпутацкіх груп у буйных прыгарадных саўгасах і калгасах.

Пры гарсавеце арганізаваны арганізацыйна-масавы аддзел, які пакуль што складаецца з 3-х працаўнікоў, але ён пачаў ужо разгортваць масавую работу ў горадзе і на вёсцы. Ёсьць усе падставы да таго, што работа аргмасавага аддзелу гарсавету ў хуткім часе набудзе адпаведны размах і атрымае добрыя вынікі.

Гарсавет даў дырэктыву сэкцыям аб вылучэньні ім 26 грамадзкіх інструктароў.

На пленумах сэкцый гарсавету вылучаны брыгады для праверкі выкананьня дадзеных гарсаветам дырэктыў па розных пытаньнях. Гарсавет пераглядаў сьпісы свайго актыву і, выкрэсьліўшы пасыўных, шырока разгарнуў вярбоўку новых актывістаў. Гэтая вярбоўка праводзілася непасрэдна членамі Гарсавету, дэпутацкімі групамі і аргмасавым аддзелам гарсавету. У выніку гэтага завербавана каля 400 рабочых, студэнтаў, спэцыялістаў і працоўных жанчын. Новыя актывісты прымаюць шчыры ўдзел на ўсёй рабоце гарсавету, актыўна працуючы ў дэпутацкіх групах і розных брыгадах.

Некаторыя дэпутацкія групы гэтай мабілізацыі актыву налічваюць да 100 і звыш членаў. У выніку ўдарнай работы сэкцыі Ахозы Здароўя ў Віцебску за апошні час значна палепшылася работа лекавых установ. Па лініі гаркому КП(б)Б даны дырэктывы ўсім парткалектывам аб раепрацоўцы ліста ЦКК РСІ і ЦСПСБ пра ажыўленьне работы саветаў на прадпрыемствах. Гэты-ж ліст распрацаваны на пленумах усіх сэкцый гарсавету. Для асьвятленьня работы сэкцый у мясцовым друку на прадпрыемствах сэкцыямі вылучаны селькоўскія апэрацыйныя пасты і брыгады.

Усе сэкцыі гарсавету ўключыліся ў барацьбу за месца ў «Чырвонай кнізе» і ўся работа імі праводзіцца пад гэтым лёзунгам. Гарсаветам праводзіцца адпаведная палітычна-масавая работа на вёсцы за ўключэньне прыгарадных сельсаветаў у спаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў».

Н. А

Спаборніцтва „Бальшавік“—„Камунар“

Газэце „Савецкая Беларусь“, Менскаму Гарадзкаму Савету

Рапарт дэпутацкай групы „Камунар“

Дэпутацкай групай заводу «Камунар», якая арганізавалася ў маі месяцы 1931 г. прароблена наступнае:

1. На пленуме дэпутацкай групы быў заслухан даклад дырэктара заводу аб выкананьні прамфінпляну і содаклады брыгад дэпутацкай групы, якія абсьледвалі выкананьне прамфінпляну, пасьля чаго былі:

а) Устаноўлены сталыя зьмены.

б) Ліквідавана ўраўнілаўка і абязьлічка па пытаньні зарплаты рабочых.

2. Праводзіцца сыстэматычная работа з ударнікамі заводу шляхам скліканьня сходаў ударнікаў прэм'раваньня і г. д. Разам з гэтым вядзецца барацьба з лодырамі, лятунамі і прагульшчыкамі, шляхам правядзеньня грамадзкіх судоў, і зьмяшчэньня іх на чорных дошках насьценных газэт, шматтыражак і г. д.

3. Па дэпутацкай групе быў заслуханы даклад аб становішчы рацыяналізатарскай работы на заводзе, дзе было прапанавана зьвязацца з канструктарскім бюро заводу, а таксама было прапанавана абрань больш працаздольнага старшыню рацыяналізатарскага бюро. Зараз дабіліся таго, што ўсе рабочыя прапановы і вынаходніцтвы разглядаюцца на рацыяналізатарскім бюро сумесна з рабочымі, даюцца адпаведныя тлумачэньні, пасьля чаго прапрацоўваюцца на вытворчых цэхавых нарадах і праводзяцца ў жыцьцё.

4. Дэпутацкая група ўключылася ў фінэстафэту, і дабілася 100 процантнай падпіскі на пазыку «трэці рашаючы год пяцігодкі».

Праведзена калектыўнае страхаваньне па цэхах і значна павялічана колькасьць укладчыкаў у ашчадкасы.

5. Дэпутацкая група прыняла актыўны ўдзел у справаздачнай і перавыбарчай рабоце заўкому, шляхам вылучэньня брыгад, якія былі прымацаваны да кожнага цэху.

6. Па тэфскай рабоце дэпутацкай групай прароблена наступнае:

а) Выезд у прыгарадны калгас «Новы сьвет» для праверкі выкананьня сацумовы з дэпутацкай групай заводу.

б) Вылучан брыгадзір па правядзеньні кампаніі бульбазагатовак г. Ленінграду.

7. Была абсьледвана заводзкая сталоўка, пасьля чаго быў зроблен суботнік па ўборцы і ўпарадкаваньні работы сталоўкі. Было праверана скарыстаньне ўсіх унутраных рэсурсаў сталоўкі і разьмяшчэньне абслугоўваючага пэрсаналу сталоўкі. Была склікана вытворчая нарада па палепшаньні якасьці абеду, таксама праведзены пэхсходы аб санмінімуме сталоўкі. Працуе сталая вылучаная брыгада дэпутацкіх груп.

8. Па палепшаньні жыльлёвых умоў рабочых былі вылучаны брыгады, якія склалі акты аб жыльлёвым становішчы, у выніку чаго некалькі рабочых атрымалі кватэры.

9. Былі праведзены справаздачы дэпутатаў Гарсавету перад выбаршчыкамі, а таксама быў прыняты актыўны ўдзел у правядзеньні справаздачнай кампаніі Гарсавету па Менску.

10. Устаноўлены сталыя дзяжурствы дэпутатаў на вытворчасьці.

11. Група налічвае 65 членаў і 108 дабраахвотнікаў - ударнікаў вытворчасьці.

Уся праца дэпутацкай групы праводзіцца ўзгоднена з трохкутнікам заводу.

Зараз дэпутацкая група заводу «Камунар» бярэ на сябе выкананьне праграмы-мінімуму і ўключылася ў сацспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў». Дэпутацкая група заводу бярэ на сябе абавязкі:

1) Праверыць выкарыстаньне жаночай працы.

2) Вылучыць з актыву групы некалькі асоб на працу па сацсумяшчэньні.

3) Дабіцца адкрыцьця дзіцячага саду.

4) Правесьці санітарны мінімум на заводзе.

Дэпутацкая група заводу «Камунар» выклікае на сацспаборніцтва за лепшае выкананьне праграмы--мінімуму дэпутацкую групу заводу «Бальшавік».

Бюро дэпутацкай групы:
Старшыня ЯКУЦЁНАК
Брыгада «С. Б.» на «Камунары»
ФРЫДМО, ПЕКУР, КРЭМЕНЕЎСКАЯ.

Па ўсёй БССР правесьці спэцыялізаваныя нарады рабселькораў

Усім ГК, РК КП(б)Б, рэдакцыям цэнтральных, раённых і шматтыражных газэт

Па пастанове Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б на працягу лістапада і першай дэкады сьнежня ва ўсіх гарадох і раёнах БССР неабходна гаркомам і райкомам КП(б)Б, разам з рэдакцыямі раённых газэт правесьці масавыя куставыя спэцыялізаваныя нарады тэрмінам у 1—2 дні рабселькораў і рэдкалегій усіх штодзённых насьценных газэт (асобна павінны зьбірацца рабкоры - чыгуначнікі, асобна рабселькоры ільнаводных саўгасаў і калгасаў і асобна рабкоры працуючыя ў сыстэме спажывецкай кааперацыі).

Неабходна абавязкова забясьпечыць удзел у нарадах партыйнага, прафсаюзнага і камсамольскага актыву, а таксама спэцыялістых і кіруючых гас падарчых работнікаў транспарту, спажывецкай кааперацыі, калгасаў і саўгасаў.

Абвестка дню нарад раіцна наступная:

1. Даклад «Вынікі пленумаў ЦК Усе КП(б) і аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і задачы рабселькораў і нізавога друку» (гэты-ж даклад павінен абавязкова ўключыць у сябе спэцыяльныя разьдзелы аб задачах рабселькораў і нізавога друку ў барацьбе за ленінскую нацыянальную палітыку, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе і шавінізму ўсіх іншых колераў, а таксама аб задачах нізавога друку і рабселькораў у зьвязку з падрыхтоўкай і правядзеньнем перавыбараў парторганаў).

2. Даклад аб ходзе практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў і аб задачах абвешчанага газэтай «Правдой» усесаюзнага конкурсу насьценных газэт саўгасаў, калгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў;

а) Кароткія садаклады рэдкалегій усіх прадстаўленых на нарадзе шматтыражных і насьценных газэт з паведамленьнем аб канкрэтна праведзенай рабоце па ўключэньні ў конкурс.

б) Паведамленьне аб воцыце штодзённай насьценнай газэты калгасу «Случ» (Слуцкага раёну), у барацьбе за выкананьне асноўных гаспадарча-палітычных задач партыі (матар'ял для дакладу па гэтым пытаньні рассылаецца газэтай «Рабселькор» усім РК КП(б)Б і рэдакцыям раённых газэт).

3. Аб правядзеньні па раёне масавай кампаніі барацьбы за 10.000 тыраж усебеларускай газэты «Рабселькор» і 100.000 тыраж усесаюзнага часопісу «Рабоче - Крестьянский Корреспондент».

Для фабрычна - заводзкіх цэнтраў БССР абгаварэньне другога пункту аб весткі дню нарады рабселькораў павінна ў прыватнасьці праходзіць пад кутом абгаварэньня выкліку газэты «Рабочий» і шматтыражных газэт прадпрыемстваў Менску аб шэфскай дапамозе нізавому друку падшэфных вясковых раёнаў з вызначэньнем пэўных канкрэтных масавых мерапрыемстваў у гэтым напрамку (матар'ялы па гэтым пытаньні зьмешчаны на першай старонцы газэты «Рабочий» ад 21-га лістапада 1931 г.). На нарадах рабкораў - чыгуначнікаў неабходна разгорнута абгаварыць пытаньне аб уключэньні ва ўсесаюзны конкурс на лепшую спараную брыгаду («Правда» ад 21 лістапада).

Пасьля правядзеньня нарад рабселькораў неабходна адразу правесьці асобную нараду радактароў усіх штодзённых насьценгазэт, на якой заслухаць даклады радактароў газэт аб маючымся вопыце па выданьні штодзённых насьценных газэт. Нарады радактароў штодзённак павінны ў нарадку падрыхтоўкі да **ўсебеларускай нарады радактароў штодзённых насьценных газэт** вызначыць мерапрыемствы па пытаньнях зьвязаных з узмацненьнем большавіцкай баяздольнасьці фабрычных і калгасных штодзённак у барацьбе за генэральную лінію партыі.

Падкрэсьліваем, што культпроп ЦК КП(б)Б надае **выключна важнае палітычнае значэньне** падрыхтоўцы і правядзеньню ўсесаюзнага конкурсу насьценных газэт МТС, саўгасаў і калгасаў, а таксама справе грунтоўнай напярэдняй падрыхтоўкі да нарад і правядзеньню гэтых нарад рабселькораў на высокім палітычным узроўні.

Нарады рабселькораў павінны забясьпечыць яшчэ большую мабілізацыю ўсяго нізавога друку на выкананьне асноўных гаспадарча - палітычных задач, на выкананьне 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна, на ўзьняцьце ролі нізавога друку ў барацьбе за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, як цэнтральную задачу ў барацьбе на два франты, супроць правага ўхілу — галоўнай небясьпекі, супроць «левых» загібаў і прымірэнчых адносін да ўхілаў і за практычнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і бязьлітаснай барацьбы супроць праяў вялікадзяржаўнага шавінізму — найбольш небясьпечнага на даным этапе, супроць контрэвалюцыйнага беларускага нацыянал - дэмакратызму і супроць шавінізму ўсіх іншых колераў і адценьняў.

Заг. Культпропам ЦК КП(б)Б
Чарнушэвіч.

Заг. Сэктарам Друку Культпропу
ЦК КП(б)Б Курцік.

„Тоэба арганізаваць збожжазагатоўкі“ Сталін

Ліквідаваць самацёк і безадказнасьць

у выкананьні пляну збожжазагатовак

Хонаўск і Брака скі сельсаветы павінны быць рашуча ачышчаны ад кулацкіх агентаў

Бязьлітасна выкінуць кулацкіх агентаў з загатоўчага апарату

Гэтымі днямі пры Магілеўскім РВК адбылася нарада старшынь сельсаветаў па абгаварэньні ходу загатовак.

На гэтай нарадзе выявілася, што значная частка сельсаветаў не мабілізавалася на баявую рэалізацыю пастаноў партыі і ўраду аб загатоўках. Больш таго, некаторыя старшыні сельсаветаў выявілі яўнае нежаданьне змагацца за пасьпяховае выкананьне гэтых дырэктыў, паказалі свой апартуністычны твар агентаў кулака. Так старшыня Бракаўскага сельсавету імкнуўся давесьці, што загатоўкі па сельсавеце праходзяць вельмі добра, без «усякай» клясавай барацьбы. Між тым гэты сельсавет лічыцца адным з самых адстаючых па ўсіх відах загатовак. Плян па збожжазагатоўках выкананы ўсяго на 29 проц., па загатоўках бульбы — 26, сена—на 60, саломы—на 9 Цьвёрдыя заданьні з кулацка -заможных гаспадарак па ўсіх відах загатовак спаганы на больш як на 20 проц.

Раённая газэта «Камунар Магілеўшчыны» шмат разоў сыгналізавала аб ганебным адставаньні збожжазагатовак па Бракаўскім сельсавеце, але апошні ня гледзячы на гэта ўсё-ж такі нічога не зрабіў для таго, каб узьняць тэмпы загатовак.

Старшыня Хонаўскага сельсавету Хівук (член партыі) выступіў з яўна кулацкімі ўстаноўкамі ў правядзеньні збожжазагатовак. Прапаведваючы кулацкую тэорыю «нерэальнасьці пляну» Хівук урэшце дагаварыўся і да яўна контрэвалюцыйных прапаноў на кшталт ўжыцьця да бядняцка - сярэдняцкіх гаспадарак такіх-жа мер узьдзейнічаньня, як і да кулацка-заможных гаспадарак.

Хонаўск сельсавет, старшынёй якога зьяўляецца Хівук, да часу нарады яшчэ ня даў цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам па загатоўках насеньня траў і гародніны і наогул адмовіўся рэалізаваць пляны гэтых загатовак. Гэтак-жа адносяцца да загатовак Дасовіцкі і Таранаўскі сельсаветы.

Загатоўчыя арганізацыі ў прыватнасьці райспажыўсаюз ня кіруюць ходам загатовак. Зьвесткі аб выкананьні плянаў загатовак даюцца нізоўкай безадказна, таму ў зводках заўсёды бываюць разыходжаньні.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што асноўнай прычынай недапушчаль на-маруднага ходу загатовак у Магілеўскім раёне зьяўляюцца апартуністычныя адносіны асобных вясковых арганізацый да выкананьня загатоўчых плянаў, слабая барацьба з кулацтвам і яго агентурай, адсутнасьць масавай работы сярод калгасных мас і бядняцка-сярэдняцкай часткі аднаасобнікаў.

Партячэйкі, сельсаветы, праўленьні калгасаў павінны зараз-жа крута ўзьняць тэмпы загатовак з тым, каб у найкарацейшы тэрмін поўнасьцю выканаць загатоўчыя пляны.

Хонаўскі і Бракаўскі сельсаветы павінны быць неадкладна і рашуча ачышчаны ад кулацкіх паслужнікаў-апартуністаў Хівука і Ліхачова.

Брыгада «Сав. Бел.»: Ал. Нёманскі, Марскі.

З ФРОНТУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

✦ Загатоўчыя арганізацыі Клічаўскага раёну—райкалгассаюз і райспажыўсаюз не наладзілі належным чынам прыёмку збожжа і бульбы па загатоўках. Здатчыкі загатовак цэлымі днямі прастойваюць каля прыймовых пунктаў, чакаючы прыёму прывезенага збожжа.

З.

✦ Калгасьнікі калгасу «Чырвоны Пуцілавец», Сяргееўскага сельсавету, Пухавіцкага раёну, у часе разьмерка ваньня ўраджаю здалі дзяржаве 17 тон бульбы і 20 цэнтн. збожжа.

— Лішкі ў першую чаргу дзяржаве—заявілі калгасьнікі.

Лубін.

✦ У баку ад збожжазагатовак стаіць камсамольская ячэйка Шылаўскага сельсавету, Магілеўскага раёну. Сельсавет вельмі адстае ў выкананьні пляну збожжазагатовак.

С. Лявіцкі.

✦ Юшкоўскі сельсавет, Любанскага раёну, не праводзіць сярод калгасьнікаў належнай растлумачальнай работы аб збожжазагатоўках. Сельсавет давёў да калгасьнікаў калгасу «Чырвоны Земляроб», якія яшчэ не абагулілі свае пасевы, цьвёрдыя заданьні па збожжазагатоўках. Гэты «лявацкі» загіб сельсавету павінен быць зараз-жа выпраўлены.

Селькор.

А. Кучар, А. Куляшоў

Разброіць „чырвоную“ халтуру

«Марксысцкая крытыка павінна рашуча выганяць з свайго асяродку ўсялякае пратэнцыёзнае, паўпісьменнае і самазадаволенае камчванства. Марксысцкая крытыка павінна паставіць перад сабой лёзунг—вучыцца і павінна даваць адпор усякай макулатуры і адсябяціне...» (З рэзалюцыі ЦК РКП, 1925 год).

Апошні пленум ВОАПП падкрэсьліў, што ў наш час, так званая «чырвоная халтура», якая трапляе на старонкі нашага друку яшчэ ў значных памерах зьяўляецца наступам клясаварожых нам сіл на літаратурным фронце. Халтура маскуецца за вонкава прыгожую, але пустую фразу, яна прыкрываецца «рэвалюцыйным» ура і барабанным боем.

Чырвонай халтурай прыкрываецца і першая частка папутнікаў, якія сапраўдную арганічную перабудову ў набліжэньні да пралетарскай літаратуры заміняюць прыстройкай, прыставаньнем.

Карэньні «чырвонай» халтуры вельмі часта хаваюцца за літфронтаўскія і лефаўскія, варожыя нам, творчыя ўстаноўкі. Іх мэтады лакіроўкі рэчаіснасьці, спрошчанага разуменьня складанасьці рэчаіснасьці, прасталінейнасьці і адсутнасьць глыбокага пранікненьня ў зьявы—служаць маскай і шырмай для праяўленьня «чырвонай» халтуры.

У нашых беларускіх умовах разам з вялікім якасным ростам пралетарскай літаратуры і літаратуры рабочых ударнікаў, расьце і актыўнасьць «чырвонай» халтуры.

***

Ня трэба думаць, што «чырвоная» халтура абавязкова і заўсёды праяўляецца ў формах літаратурнай (тэхнічнай) няпісьменнасьці. Ёсьць людзі, што дасканала валодаюць літаратурнай тэхнікай і якія замест глыбокай і сапраўды арганічнай перабудовы прыстасоўваюцца, механічна прыстройваюцца да пралетарскай літаратуры.

Максім Лужанін, у мінулым быў у палоне нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі і творчасьць яго выражала нацдэмаўскія ідэі. І вось замест таго, каб рэзка крытыкуючы свой мінулы шлях, перамагаючы яго актыўным уключэньнем ва ўсе працэсы сацбудаўніцтва і ў творчасьці сваёй паступова набліжацца да пазыцыі рэвалюцыйнага папутніцтва, Лужанін лефаўскай фразай, робленым халодным вобразам, у каторым няма ні кроплі цяплыні і любоўных адносін да людзей, якія будуюць сацыялізм, імкнецца ставіць сябе ў рады людзей блізкіх да пралетарскай літаратуры. Гэта ёсьць не перабудова, а прыстройка, гэта ёсьць не перабудова, а спэцыфічны від варожай нам халтуры.

Тэмпаў, рук цана!
Рэканструкцыя!

Гэты сухі літфронтаўскі вобраз, вонкавы індывідуалістычны гэст можа пераканструявацца ў залежнасьці ад палітычных «ўмоў» і «нашым» і «вашым».

Цікава, што амаль ва ўсёй творчасьці М. Лужаніна чалавек падмяняецца машынай:

Дайце-ж і трактару новых сіл,
Каб ён на лета вышаў ударнікам.

У Лужаніна да будаўніка сацыялізму да рэвалюцыянэра, казённыя, «пісарскія» адносіны. Паслухайце, што ён піша пра расстрэлянага партызана:

Калі—
Маладзела на Ўсходзе зара,
Магутным уздымам
Нястрымнага руху—
Скажэце,
Ці лёгка было паміраць
Таварышу Саладуху?

І якой шчырасьцю і цяплынёй, праз колькі радкоў, гучаць словы жалю пра гібель зуброю з Белавескае пушчы—гэтае «велічы»—нацдэмаўскае самабытнасьці:

Варажыць табе меўся месяц,
Напаіў цябе чортаў брод
Разламі—шпаркі лёт экспрэсаў.
Затрубі ў свой турыны рог.

Так перабудоўваецца М. Лужанін.

У сэнзцы вершаў «Дні спатканьня са зброяю» М. Лужанін хоча паказаць розьніцу паміж дарэвалюцыйным прызывам у войску і савецкім. Замест таго, што раней:

Прыходзілі тупа (?! А. К. і А.К.) запісвацца у воласьць».

Цяпер:

Наперэўна шырока растоптаны сьцежкі
Што маці салдата вітае ўсьмешкай.

Акрамя гэтага розьніцы паміж царскім прызывам і савецкім Лужанін ня бачыць. У яго чырвонаармейцы змагаюцца і «падымаюць песьню ў сопечных шклянках».

За нашы вінтоўкі
За вочы каханкі

Таму, што ў вачох дзяўчат
Ня будзе адчаю,
Хіба... Пацалуюць...
Мацней як звычайнэ.

За гэтыя моцныя пацалункі—па Лужаніну ідуць змагацца нашыя чырвонаармейцы.

Так апашляецца ў Лужаніна вобраз чырвонаармейца.

Канарэечная, мяшчанская пошласьць ранейшай творчасьці М. Лужаніна—у новых формах ўваходзіць у арсэнал яго цяперашняй паэзіі:

І—рукі на шыі—былі
І—вочы ў вочы—былі
І—вусны на вусны—былі

І—вочы і вусны былі
І—рукі апалі няма.
І—вочы завялі няма.
І вусны сказалі няма.

і г. д., у гэтакім «любоўным» стылі дастойным самага Ігара Северяніна.

Як-жа Максім Лужанін б'е нацыянал-дэмакратаў, выразьнікам ідэі каторых ён быў у свой час.

Па Лужаніну розьніца паміж пралетарыятам і ворагамі выражаецца «праблемай» функцыі зубоў:

А пасьля—паказалі зубы.
Давялося іх— па вусах
Нам—дык есьці патрэбны зубы
Ім патрэбны былі—кусаць.
(з поэмы «Галасы гарадоў»).

А фашысты на думку Лужаніна займаюцца тым, да рэчы нейкім дзіўным заняткам, што вырошчваюць на мужыцкім целе панскую галаву

Як ні тужыліся-б там,
Ні хацелі,
І які ня ўчынялі-б гвалт.
Не ўзрасьце на мужыцкім целе
Панская галава. («Галасы гарадоў»)

Так спрошчваецца і апашляецца клясавае змаганьне.

Мы маем такую прыстройку Лужаніна ў беларускай літаратуры побач з нашымі папутнікамі, якія па сапраўд наму адыходзяць ад сваіх мінулых нацыяналістычных памылак, арганічна перабудоўваючыся набліжаюцца да пралетарскай літаратуры (К. Чорны і іншыя).

Трэба сказаць, што творчы мэтад М. Лужаніна, які выходзіць з лёфаўскай—шклоўскай тэорыі — «остранения» і якая рэалізуецца ў Лужаніна фармалістычнымі прыёмамі—зьяўляецца мэтадам наскрозь ідэалістычным. Вельмі часта ў Лужаніна праяўляецца інтэлігенцкае сюсюканьне пры паказе нашых фабрык і заводаў, інтэлігенцкае гістэрычнае «преклонение» перед магутнасьцю гэтых заводаў.

І чым хутчэй сам Лужанін зразумее палітычную памылковасьць таго шляху, на якім ён цяпер стаіць тым лепш гэта будзе для яго самаго, калі ён жадае да рэвалюцыйнага папутніцтва ісьці пад сьцягам санраўднай перабудовы. Трэба ясна сказаць, што тыя фармалістычныя выкрунтасы школы Лефа, і канструктывістых, якімі карыстаецца Максім Лужанін, належаць да ліку буржуазнае літаратуры і нічога агульнага з пралетарскай літаратурай ня маюць. Пра гэтыя канструкцыівісцкія і лефаўскія выкрунтасы сьведчыць і багата разьведзеная «ружовай» вадзіцай апошняя паэма Лужаніна «Галасы гарадоў».

***

Вельмі часта ў нашых пісьменьнікаў сацыялістычнае будаўніцтва з усёй яго складанасьцю і шматграннасьцю ўспрыймаецца прасталінейна, груба, бяз любасьці да гэтай рэчаіснасьці, халтурна, без жаданьня рэвалюцыйна нерарабіць рэчаіснасьць:

За краіну маладую—бі, гасі (Каго? А. К.—А. К.)
Чорны вецер не задуе творчых сіл
(М. Багун. «Рэха бур», 1931 г.)

***

Аднак, зараз, «чырвонай» халтуры ўплывае, пранікае і ў творчасьць асобных членаў асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў. Праяўляецца яна ў выглядзе ўплыву халтуршчыкаў буржуазнай-літаратуры на нашы рады. Вось чаму патрэбна жорсткая самакрытыка ў нашых белаппаўскіх радах, каб выкрыць, выкараніць гэтую шкоду. Але ня трэба блытаць прадстаўнікоў буржуазнае, варожае нам халтуры, у якіх сыстэма халтуры зьяўляецца органічнай і служыць зброяй барацьбы супроць нас, з асобнымі ўплывамі гэтае халтуры на асобных белаппаўцаў.

Некаторыя нашы старэйшыя пісьменьнікі, якія шмат год працуюць у галіне літаратуры, зусім не разумеюць, нясьлыбока ўспрыймаюць асноўныя моманты нашай рэчаіснасьці. Іл. Барашка, у сваёй кнізцы «На розныя тэмы», паказваючы гэраіню грамадзянскай вайны Сьцёпу, зьвёў гэты вобраз у сваёй трактоўцы да фізіолёгічнага дадатку да мужа, які зьяўляецца змагаром. Аўтар хоча паказаць Сьцёпу, як яна спалучае ў сябе змагара і жанчыну. Атрымліваецца-ж што Сьцёпа і блізка змагаром ня была, а толькі пацяшала ласкамі раненага мужа. Так апашляецца вобраз рэвалюцыйнай жанчыны.

У апавяданьні «Цьвітуць сады» Барашка выхаваньне савецкіх дзяцей аддае ў рукі нейкае прастытуткі. У апавяданьні, між іншым, аўтар з нечага дзівіцца, што настаўнікі любяць музыку!!! А ў канцы-ж глыбокадумна імкнецца разважаць пра маральныя якасьці тых, каму даручана выхаваньне камуністычнага «чырвонага» пакаленьня.

Ня будзем гаварыць пра дзікую і жахлівую няпісьменнасьць аўтара Іл. Барашкі ў стылі і мове. Чытайце:

«—Ды ты пасудзі сама,—гаварыў ёй часта Платон,—я быў малады чырвоны баец. Сьцёпа была маё першае каханьне, Сьцёпу я спаткаў ў тыя галодныя, халодныя часы, калі сьмерць капала магілы маім найбліжэйшым таварышам. Сьцёпа пайшла за мною, яна ня раз ратавала мяне ад вернай сьмерці. Яна сваімі ласкамі лячыла мае ўзбуджаныя кулямі, гарматамі, калючым дротам, дрэннымі настроямі чырвонаармейцаў—нэрвы.

Я не магу пазбыцца (?) яе. Да яе ў мяне каханьне, сваясаблівае адменнае і непахіснае...

І тады жонка (другая—А. К. і А. К.) змоўкла. Яна сваімі гутаркамі, ласкамі і адносінамі да Платона старалася замяніць яму першую, неадменную, сваясаблівую Сьцёпу».

Прыгадаем вядомага халтуршчыка Ю. Лявоннага. Пра яго ўжо шмат казалі. У Лявоннага халтура, якая ў большасьці таварышоў спалучаецца з палітычнай памылковасьцю, а часамі і шкодніцтвам. Усё гэта прыкрываецца ідэйствам убогага зьместу і ўбогай формы. (Яго «камсамольскія вершы», нахабны і паталёгічны верш «Аборт»). Нядаўна гэты арсэнал папоўніўся новым вершам «Размова з поэтам ударнікам»

Усе яго ідэялы зводзяцца да:
Я хачу ня шмат чаго—
Суму, каб разьвеяцца,
Ды таго, гарачага, (?)
Што ў вачох сінее так.

Тав. Ліхадзееўскі піша паэму пра клясавае змаганьне навакол арганізацыі калгасу, з называецца паэма «Крывавыя зьнічкі на сьнезе». І вось замест таго, каб глыбока прааналізаваць і выкрыць, зрываючы ўсе і ўсякія маскі з клясавага ворага, яго шкодніцкую дзейнасьць, падаецца ў звычайных шаблённых формах і выразах забойства селькора-калгасьніка. Поэтычная «безвкусица» і няўменьне разабрацца ў эмпірычным матар'яле, прыводзяць да таго, што аўтар у дзікім экстазе дае нам ажно 18 натаваньняў кулака над селькорам. Сюды ўваходзяць:

1) Адрэзалі вушы. 2) І вынялі вочы... 3) і ў грудзі ўсадзілі навостраны нож. 4) здавілі за горла, 5) і горла хрыпоча 6) і нечым халодным прабеглі сьпіной (угэ! А. К. і А. К.). 7) адрэзалі вушы (іаноў!) 8) парэзалі шчокі... 9) разьдзелі да гола 10) паклалі на лёд:.. 11) і хтосьці далёка затворам зашчоўкаў, 12) скрывавілі губы. 13) скрывавілі цела... 14) з агідаю плюнулі ў твар малады. 15) скакалі і... 16) грызьлі ў смак... як хацелі... 17) пранізваюць цела; 18) пранізваюць грудзі ў ярка чырвонай крыві барада (ад гэтуль відаць і «Крывавыя зьнічкі на сьнезе» А. К. і А. К.) [9]) і ў глыбі бліжэйшай змарожанай студні ў ва ўсплескі ўзьвілася вада (героя затапілі А. К. і А. К.).

І ў выніку чытач размагнічаны аўтарам—усім гэтымі дзікімі жудасьцямі. Аўтар не мабілізуе чытача на змаганьне з ворагам, а прымушае яго сумняваць ў правільнасьці аўтаравых слоў. Гэткай-жа паэтычнай «безвкусицей» і адсутнасьцю сур'ёзнага выкрыцьця рачаістасьці характарызуюцца і некаторыя іншыя творы тав. Ліхадзіеўскага (напрыклад, «Ну, дзяўчаты не качай») Карэньні гэтых хібаў у нізкім узроўні сьветагляду аўтара.

Трэба тут заўважыць, што ў тав. Ліхадзіўскага памылкі халтурнага парадку не зьяўляюцца сыстэмай, а праяўляюцца ў выглядзе асобных памылак у асобных творах.

***

У нашай крытыцы халтура займае яшчэ значнае месца. Халтурыць Цітоў. Галубок, Сядура, праўда ва ўсіх гэтых таварышоў халтура, як ня трэба лепш спалучаецца з палітычнай памылковасьцю і шкодніцтвам (рэцэнзія Галубка на «Камсамольскія вершы» Ю. Лявоннага, апартуністычны артыкул У. Сядуры пра паэтычны фронт).

Вось перл з акадэмічных шуканьняў Ул. Сядуры, дзе яскрава выяўляецца палітычная і літаратурная няпісьменнасьць:

«А сфэра ўтылітарнай дзейнасьці пралетарск

Пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

АБ ЧЫГУНАЧНЫМ І ВОДНЫМ ТРАНСПАРЦЕ

Заслухаўшы даклады дырэкцыі МШБ і Заходніх чыгунак і садакład ЦККРСІ аб рабоце дарог і правядзеньні дырэктыў ЦК УсеКП(б) (адоз ЦК УсеКП(б) ад 10 студзеня 1931 г., рэшэньне Чэрвеньскага Пленуму ЦК УсеКП(б) Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б канстатуе, што пры наяўнасьці некаторых пазначных палепшаньняў у рабоце дарог, важнейшыя рашэньні ЦК УсеКП(б) яшчэ не выкананы і работа дарог застаецца незадавальняючай.

Партыя ня можа дапусьціць у якой небудзь меры лаўтарэньня зімовых перабояў у рабоце чыгунак. ЦК будзе лічыць мясцовыя партарганізацыі адказнымі за прарывы ў рабоце транспарту па тым альбо іншым вучастку. Увага ўсяе партыі і мясцовых партарганізацый павінна быць у яшчэ большай меры сканцэнтравана на далейшай мабілізацыі мас чыгуначнікаў для палепшаньня работы цягніка, вагона, для падвышэньня якасьці рамонта, для палепшаньня работы станцый, для ўзмацненьня працдысцыпліны, для рашучага палепшаньня работы апарату кіраўніцтва, для барацьбы з коснасьцю і бюракратызмам. Павінна быць забясьпечана рашучая барацьба за беражливае скарыстаньне транспартных сродкаў, вагонаў і цягнікоў, скарачэньне ўсякіх прастояў пад нагрузкай і выгрузкай. Неабходна штодзённая праверка і па сіленьне выкананьня заказаў транспарту ня прамысловых прадпрыемствах і палепшаньне якасьці іх прадукцыі

(З рэзалюцыі Кастрычнікаўскага Пленуму ЦК УсеКП(б)).

1. Спаранная язда на паравозах праходзіцца яшчэ ў значнай меры фармальна, адсутнічае сапраўдна-бальшавіцкая барацьба са зрывамі спаранай язды і прычынамі іх выклікаючымі, менавіта: дрэнная арганізацыя выхаду брыгад, адсутнасьць графікаў работы паравозных брыгад, адсутнасьць сталага прымацаваньня і здачы паравозаў па актах, а таксама частыя масавыя перакідкі паравозаў (па дэпо Вітебск за 2-ю палову кастрычніка—213 зрываў, альбо 11,61 проц. зрыва, па Жлобіне ў верасьні хадзіла 7 абязьлічаных паравозаў).

У мэтах сапраўднага замацаваньня спаранай язды і безагаворачнага выкананьня дырэктывы партыі аб павялічэньні сутачнай работы паравозаў на менш чым на 1 гадзіну, Пленум ЦК і ЦККК абавязвае дырэкцыі дарог, гаспадарчыя, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі раёнаў у найкарацейшы тэрмін зьнішчыць усе адзначаныя недахопы ў правядзеньні спаранай язды, цьвёрда і рашуча правесьці ў жыцьцё загад тав. Андрэева.

2. Ліквідацыя абязьлічкі ў вагонным парку—прымацаваньне пэўных паркаў да дарог і арганізацыя абменных і рамонтных пунктаў праводзіцца недапушчальна слабым тэмпам. Замест энэргічнага ажыцьцяўленьня гэтай важнейшай дырэктывы ў шэрагу выпадкаў існуе самацёк і ўтвараецца прамая пагроза невыкананьня загаду т. Андрэева аб ліквідацыі абязьлічкі вагонаў у вызначаны тэрмін.

аб'яднаны Пленум прапануе дырэкцыям дарог не пазьней 20 лістапада закончыць арганізацыю абменных і рамонтных пунктаў, забясьпечыць іх механічным абсталяваньнем, запаснымі часткамі, а таксама неабходнымі кваліфікаванымі кадрамі, службовымі і жыльлёвымі памяшканьнямі.

3. У выніку незадавальняючага правядзеньня спаранай язды, недастатковай адказнасьці паравозных брыгад, а асабліва дрэнная якасьці рамонту паравозаў і вагонаў, процант хворых паравозаў і вагонаў застаецца яшчэ высокім, (асабліва ў дэпо Вітебска). У мэтах рашучага зьнижэньня процанту хворых паравозаў і вагонаў, Пленум ЦК і ЦККК прапануе дырэкцыям дарог і начальнікам раёнаў безадкладна наладзіць правільнае планіраваньне ўсіх вытворчых працэсаў, правільна расставіць рабочую сілу па рамонту паравозаў і вагонаў, забясьпечыць снабжэньне дэпо неабходнымі запаснымі часткамі, разгарнуўшы сапраўдна-бальшавіцкую работу па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Дырэкцыі Заходніх чыгунак загрузіць завод Ленцуцкіна для выробу запасных частак забясьпечыўшы яго адпаведнымі матар'ялам.

4. У эксплёатацыйнай рабоце транспарту не вядзецца рашучай барацьбы з коснасьцю і непаваротлівасьцю, з апартуністычным самацёкам, няма дастаткова чоткага камандаваньня, у выніку чаго эксплёатацыйная работа па ўсіх раёнах БССР зьяўляецца жыла нездавальняючай: няма чоткай работы дыспэтчарскага апарату і станцыйных агентаў асабліва на распаразьдзельных і вузлавых станцыях, дрэнна і пастаўлена плянаваньне як перарыдычнае, так і апэрацыйнае па грузавых перавозках, нізкі процант і дрэнная якасьць маршрутызацыі і спэцыялізацыі цягнікоў, нізкі процант сьледаваньня таварных цягнікоў паводле раскладу і што асабліва недапушчальна,—вялікі процант спазьненьняў пасажырскіх цягнікоў.

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦККК абавязвае дырэкцыі дарог і раёны забясьпечыць поўнае правядзеньне загаду т. Андрэева аб маршрутызацыі і спэцыялізацыі цягнікоў, палепшыць плянаваньне, укамплектаваць адпаведныя групы ў дырэкцыях і раёнах, безадкладна ўстанавіць стандартныя нормы прастою і дасканалыя расклады падачы і ўборкі вагонаў. Дырэкцыям дарог у дэкадны тэрмін узмацніць аддзелы эксплёатацыі раёнаў і дыспэтчарскі апарат, рэзка павялічыўшы партыйную прослойку і народ работнікаў эксплёатацыі. Пленум даручае бюро дадаткова мабілізаваць партыйна-камсамольскую групу работнікаў для ўзмацненьня эксплёатацыйнай работы чыгункі.

5. Асабліва недапушчальным аб'ядкамы пленум лічыць зацяжку і нерашучасьць у правядзеньні пастановы партыі аб арганізацыі працы і ліквідацыі «лявацкай» ураўнілаўкі ў заработнай плаце. З боку гаспадарнікаў і прафсаюзных арганізацый на транспарце прамяўляецца яўная недацэнка рашаючай важнасьці правядзеньня прагрэсыўна-зьдзельнай і прэм'яльнай аплаты працы ва ўсіх зьвеньнях.

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦККК катэгарычна абавязвае гаспадарчыя, прафсаюзныя і партыйныя арганізацыі на транспарце безадкладна ажыцьцявіць дырэктыву аб арганізацыі працы, ліквідацыі ўраўнілаўкі і правядзеньне прагрэсыўна-зьдзельнай і прэм'яльнай аплаты.

6. Становішча працоўнай дысцыпліны ўсё яшчэ застаецца нездавальняючым. Гаспадарчыя, прафсаюзныя і партыйныя арганізацыі не вядуць належнай барацьбы з парушэньнямі працоўнай дысцыпліны, шырокія масы рабочых не мабілізуюцца на барацьбу з кожным асобным выпадкам парушэньня яе, як з боку рабочых, так і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу. Слаба праводзіцца прэм'яваньне лепшых ударнікаў. Недастаткова ўкарэнена сапраўдная адказнасьць выканаўцаў за даручаную работу, няма рэгулярнай і настойлівай праверкі выкананьня. Адным з вынікаў такога становішча з працоўнай дысцыплінай зьяўляецца значная колькасьць здарэньняў.

Пленум ЦК і ЦККК ставіць перад партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі на транспарце задачу рашучай барацьбы за працоўную дысцыпліну, як адну з важнейшых і асноўных задач.

7. Гаспадарчы разьлік, як асноўны рычаг правільнай арганізацыі гаспадаркі і скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў на ўсіх раёнах і асобных гаспадарчых зьвеньнях, фактычна адсутнічае. З боку раду гаспадарнікаў назіраецца простае апартуністычнае супрацьдзейнічаньне і ігнараваньне гаспадарчага разьліку.

Пленум ЦК і ЦККК абавязвае дырэкцыі дарог, раёны, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі забясьпечыць са праўднае правядзеньне гаспадарчага разьліку ва ўсіх зьвеньнях не пазьней чым да 1 студзеня 1932 г. Прыняць рашучыя меры па эканоміі апалу. Дырэкцыям дарог і начальнікам раёнаў спусьціць ва ўсе нізавыя зьвенні нарады-заказы і прамфінплан, арганізаваць вучоты работы па ўсіх зьвеньнях.

Дырэкцыям дарог настойліва дабівацца перад НКПС тэрміновага вырашэньня ўсіх пытаньняў зьвязаных з правядзеньнем гаспадарчага разьліку.

8. Транспартная каапэрацыя яшчэ не спраўляецца з ускладзенай на яе задачай па бесьперабойным забесьпячэньні рабочых, пашырэньні і палепшаньні грамадзкага харчаваньня, мак сымальнага скарыстаньня мясцовых харчовых і прамтаварных рэсурсаў, аб'яднаны Пленум ЦК і ЦККК прапануе ўсім каапэрацыйным арганізацыям зьвярнуць якія-б та ні было перабоі ў забесьпячэньні рабочых транспарту, палепшыць грамадзкае харчаваньне, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на разгортаньне мясцовых загатовак. Абавязаць Наркамснаб і Белкаапсаюз аказаць максымальную дапамогу транспартнай каапэрацыі, недапушчаючы зьнижэньня фондаў з мясцовых рэсурсаў, выдаючы іх поўнасьцю ў суадпаведнасьці з колькасьцю чыгуначнікаў. Пленум падрэсьлівае, што справа палепшаньня рабочага забесьпячэньня зьяўляецца адной з важнейшых задач гаспадарчых, партыйных, прафсаюзных арганізацый на транспарце. Пленум даручае бюро ЦК забясьпечыць выкананьне дырэктывы ЦК УсеКП(б) ад 16-X—1931 г. аб пасылцы 10 адказных работнікаў на ўзмацненьне транспартнай каапэрацыі.

9. Адзначаючы нездавальняючае становішча жыльлёвых і бытавых умоў рабочых-чыгуначнікаў ва ўсіх раёнах (асабліва па Жлобіне і Воршы) і зусім недастатковую ўвагу з боку гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый да палепшаньня жыльлёвых і бытавых умоў, Пленум ЦК і ЦККК абавязвае дырэкцыі дарог фарсаваць скачэньне намечанай на 1931 г. праграмы жыльлёвага і бытавога будаўніцтва, на працягу лістапада прывесьці ў належны парадак дэпо (асьпяленьне, асьцяклеьне, палепшаньне санітарных умоў і г. д.).

10. Пленум ЦК і ЦККК прапануе гаспадарчым, партыйным і прафсаюзным арганізацыям на транспарце зьвярнуць асаблівую ўвагу задачы ўзмацненьня падрыхтоўкі і правільнай расстаноўкі кіруючых кадраў, асабліва ў нізавых зьвеньнях. Неабходна весьці рашучую барацьбу з цякучасьцю кадраў, недапушчаючы частых зрываў і непатрэбных перакідак работнікаў, разгарнуць шырокую падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў, рашуча вылучаючы лепшых ударнікаў з рабочага актыву на кіруюча-гаспадарчую і партыйна-прафсаюзную работу. Пашырыць сетку і кантынгент курсаў, школ і тэхнікумаў без адрыву ад вытворчасьці, забясьпечыўшы падвышэньне якасьці вучэбнай работы.

Дырэкцыям дарог і раёнаў прыняць безадкладныя захады да поўнага ўкамплектаваньня школ ФЗУ і палепшаньня ўмоў (пабудова інтэрнатаў, вучэбных плошчы), асабліва Жлобінскай, Магілёўскай, Калінкавіцкай.

Дырэкцыям дарог і раёнаў зараз жа скласьці плян падрыхтоўкі кадраў на 1932 г., а таксама прыступіць да складаньня пляну будучай пяцігодкі.

Пленум катэгарычна забараняе перакідку работнікаў транспарту без ведама ЦК на іншую работу. Даручыць бюро ЦК разгледзець пытаньне адносна перасоўваньня раду партыйных і прафсаюзных работнікаў па най больш адказных вучастках гаспадарчай работы ўнутры транспарту.

11. Пленум прапануе дырэкцыям дарог і раёнаў безадкладна падрыхтаваць на ўсіх лініях да барацьбы з сьнежнымі заносамі, закончыўшы ўсе падрыхтоўчыя работы і забясьпечыўшы лінію неабходнымі сродкамі барацьбы (сьнегаачышчальнікі, лапаты, шчыты і інш.) не пазьней 20 лістапада.

12. Адзначаючы, што з боку клієнтуры маюць месца да гэтага часу безадказныя адносіны да скарыстаньня транспарту (несвоячасовыя і няправільныя заяўкі, затрымкі вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай, сустрэчныя перавозкі. Пленум ЦК і ЦККК прапануе безадкладна рэарганізаваць і ўзмацніць апарат па плянаваньні перавозкай і палепшыць яго работу, вылучыўшы ў якасьці старшыні МСМ т. Шапіра. Абавязаць усе гаспадарчыя і каапэрацыйныя арганізацыі (Лесбел, Белкаапсаюз, ВСНГБ) цьвёрда выконваць дырэктыву ЦК аб скарыстаньні транспарту. ЦККК прыцягнуць да суроўгай партыйнай і судовай адказнасьці вінаватых у зрыве работы траспарту.

Адначасова Пленум абавязвае Лесбел выканаць дагаворы па забесьпячэньні транспарту дрывамі і драўляным матар'ялам, а ўсе гаспадарчыя арганізацыі дакладна і ў тэрмін выканаць свае абавязкі перад транспартам.

13. Прафсаюзныя арганізацыі на транспарце яшчэ не дабіліся сапраўднай мабілізацыі рабочых мас на выкананьне асноўных вытворчых задач, па ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны, на далейшае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва і падняцьця іх на вышэйшую ступень, не праявілі належнай настойлівасьці ў ліквідацыі ўраўнілаўкі ў заработнай плаце і слаба спраўляюцца з задачай па падняцьці масавай і выхаваўчай работы на належную вышыню.

Выходзячы з гэтага аб'яднаны Пленум абавязвае ўсе прафарганізацыі на транспарце зьліквідаваць адставаньне ў прафработе, рашуча змагаючыся з момантамі абязьлічкі і безадказнасьці і апартуністычным благадушшам з боку раду прафработнікаў і прафкамітэтаў. Узмацніць нізавыя прафзьвенні (брыгада, зьмена, група), наладзіць сталае інструктаваньне, дыфэрэнцыяванае кіраўніцтва і жывую дапамогу нізавым прафорганам з боку райпрафсаюзаў і МК. ЦСПСБ забясьпечыць належную дапамогу з боку ўсіх мясцовых прафарганізацый прафсаюзам на транспарце.

14. У радзе выпадкаў камуністы і асобныя партарганізацыі не ажыцьцяўляюць кіруючую авангардную ролю на вытворчасьці, не зьяўляюцца перадавікамі ў барацьбе за лепшыя паказьнікі, ня ўся маса камуністаў і камсамольцаў уцягнуты ў сацспаборніцтва і ўдарныя брыгады. Рад партыйных арганізацый яшчэ не вядуць дастаткова рашучай і жорсткай барацьбы з апартунізмам, вочкаўшчырацельствам і бюракратызмам на транспарце.

Слаба разгорнута самакрытыка—гэта магутная зброя па выкрыцьці і зьні шчэньні недахопаў на транспарце.

Пленум ЦК і ЦККК прапануе партыйным арганізацыям галоўную ўвагу сканцэнтраваць на палепшаньне якасьці работы нізавых зьвеньняў (цэх, партгрупа, зьмена і г. д.), наладзіць апэрацыйнае, дыфэрэнцыяванае кіраўніцтва і штодзённую дапамогу нізавым партзьвеньням і дабіцца хутчэйшага аўладаньня тэхнікай камуністамі, працуючымі на транспарце.

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на ўмацаваньне работнікамі і палепшаньне кіраўніцтва нізавым транспартным друкам. Неабходна таксама значна палепшыць якасьць матар'ялу аб транспарце ў цэнтральных газэтах.

Абавязаць ЦК камсамолу палепшыць канкрэтнае кіраўніцтва і дапамогу транспартным камсамольскім арганізацыям.

15. Пленум лічыць зусім ненармальным наяўнасьць шматлікіх абсьледаваньняў на транспарце і частага адрыву вялікай колькасьці рабстнікаў ад апэрацыйнай работы. Пленум ЦК і ЦККК катэгарычна забараняе розпага роду абсьледаваньні транспартных арганізацый без дазволу ЦККК і прапануе ўсім тэрытарыяльным парткомам і транспартным партарганізацыям арганізаваць работу так, каб недапушчаць частых адрываў работнікаў транспарту ад сваёй непасрэднай апэрацыйнай работы, у прыватнасьці для шматлікіх дакладаў у розных арганізацыях.

16. Адзначаючы, што ў раёне асабліва ў нізавых гаспадарчых зьвеньнях недастаткова цьвёрда праводзіцца адзіначальле і назіраецца рад выпадкаў парушэньня адзіначальля, як па віне партыйных і прафсаюзных арганізацый умешваючыхся ў апэрацыйную работу, так і па віне саміх гаспадарнікаў, ухіляючыхся ад адказнасьці і хаваючыхся за сьпіну іншых арганізацый—Пленум прапануе гаспадарчым, партыйным і прафсаюзным арганізацыям зьвінчыць гэтае зьявішча, цьвёрда і пасьлядоўна ажыцьцяўляючы прынцып адзіначальля ва ўсіх зьвеньнях транспарту і ўтварыўшы належныя абставіны і аўтарытэт для гаспадарнікаў.

17. Ня гледзячы на рад дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб узмацненьні кіраўніцтва і дапамогі транспарту і падвышэньня адказнасьці за становішча транспарту з боку тэрытарыяльных парткомаў, да апошняга часу кіраўніцтва ў большасьці выпадкаў застаец ца павярхоўным, неканкрэтным, а замест сапраўднай дапамогі маюць месца факты ўмяшаньня ў апэрацыйнае кіраўніцтва транспарту. Аб'яднаны пленум катэгарычна патрабуе ад усіх мясцовых партарганізацый палепшаньня і дыфэрэнцыяцыі кіраўніцтва паасобнымі галінамі работы транспарту, папераджаючы, што пры ацэнцы работы мясцовых партарганізацый ЦК і ЦККК будуць улічваць становішча і работу транспарту на мясцох.

Вылучыць у вузлавых гаркомах і райкомах аднаго з членаў бюро для штодзённага кіраўніцтва работай на транспарце, мясцовымі разгрузіўшы яго ад іншых работ.

Пленум даручае бюро і сакратарыяту ЦК, а таксама гаркомам і райкомам КП(б)Б увесьці ў практыку паста ноўку дакладу аб рабоце нізавых гаспадарчых арганізацый транспарту (дэпо, станцыя, паравоз і г. д.).

18. Аб'яднаны пленум ЦК КП(б)Б і ЦККК КП(б)Б падкрэсьлівае, што ўсе стаячыя перад транспартам задачы, ліквідацыя адставаньня транспарту ад росту сацыялістычнай гаспадаркі будуць выкананы пры ўмове няўхільнага ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тав. Сталіна мабілізацыі шырокіх мас рабочых і партыйных арганізацый на барацьбу з апартунізмам, коснасьцю, вочкаўшчырацельствам, тармозячымі поўнае правядзеньне дырэктыў партыі аб узмацненьні транспарту, пры ўмовах разгортваньня сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў ва ўсёй рабоце.

Работа партыйных і камсамольскіх арганізацый поўнасьцю яшчэ не перабудавана і ў радзе выпадкаў адстае ад прад'яўляемых транспарту тэмпаў.

Аб ходзе загатовак

1. Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦККК канстатуе, што загатоўкі асноўных відаў сельска-гаспадарчай продукцыі ва ўстаноўленыя тэрміны ня выкананы, што тармозіць пасьпяховую барацьбу за выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва. Гадавы плян загатовак на хлеб выкананы на 10-XI-31 г. на 40,2 проц. (з памольным зборам), па бульбе на 43,9 проц. па ільно-насеньню на 38,9, па ільну на 4,7, па жывёлазагатоўках на 32,5 проц. квартальнага пляну.

Адставаньне ў загатоўках тлумачыцца тым, што цэлы рад партарганізацый, савецкіх загатоўчых органаў, саўгасная і калгасная сыстэмы не арганізавалі па бальшавіцку справы загатовак, прадаставілі яе самацёку, ня далі сакрушальнага адпору размовам аб нерэальнасьці загатоўчых плянаў, нявыкарысталі ў поўнай меры больш спрыяючых умоў, у якіх праходзіць загатоўчая кампанія гэтага году (вопыт клясавай барацьбы за загатоўкі, узмацненьне і рост аўторытэту партыі і савецкай улады, рост вясковых парторганізацый і інш.).

Загатоўчай кампаніі гэтага году спрыяюць тыя абставіны, што сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі зьяўляецца пераважным і асноўная маса сельска-гаспадарчай продукцыі знаходзіцца ў саўгасах і калгасах.

2. Некаторыя партарганізацыі і загатоўчыя органы замест руйнуючага ўдару па кулаку і яго агентуры ў партыі—правых і „левых" апартуністых, замест рашучай барацьбы са стаўкай кулака на зрыў загатовак, замест выкрыцьця яго новай тактыкі ў барацьбе супроць дыктатуры пролетарыяту (імкненьне ўвайсьці ў калгасы і разбурыць іх зьнутры, распаўсюджваньне спажывецкіх і рвацкіх тэндэнцый сярод адсталых груп калгасьнікаў, выкарыстоўваньне гэтых калгасьнікаў у якасьці сваёй агентуры і г. д.) дапусьцілі процінастаўленьне з боку асобных работнікаў і калгасаў мясцовых інтарэсаў пролетарскай дзяржавы, што адбівае антыпартыйную кулацкую ідэолёгію і практыку.

Вынікам права-опортуністычнай практыкі ў шэрагу раёнаў зьявілася зусім незадавальняючае, ня ў тэрмін, спагнаньне продукцыі ў парадку цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам і недаабкладаньне кулака пры наяўнасьці фактаў перагібаў у адносінах да серадняка (дача цьвёрдых заданьняў).

3. Разгорнутая масава-палітычная работа, без правядзеньня якой ня можа пасьпяхова весьціся барацьба за загатоўкі, ў некаторых раёнах ігнаравалася і была падменена прыкрай практыкай адміністраваньня. У гэтых раёнах не вялося шырокай растлумачальнай работы ў калгасах аб першачарговым выкананьні сваіх абавязкаў перад дзяржавай, не даваўся рашучы адпор антыпралетарскім імкненьням процівопастаўніць свае мясцовыя патрэбы інтарэсам дзяржавы, што выявілася ў зьмяншэньні валавой продукцыі, непамерным павялічэньні кармавых фондаў, у разважаньнях аб нерэальнасьці плянаў, рвацкіх настроях, у затрыманьні здачы (продажу) дзяржаве сельска-гаспадарчай продукцыі і г. д.). У шэрагу раёнаў існуе яўная недаацэнка ролі індывідуальнага сэктару ў загатоўках, у выніку чаго індывідуальны сэктар слаба арганізаваны на выкананьне плянаў загатовак, а таксама яўна нездавальняюча праводзіцца работа па выкананьні адпаасобнікамі кантрактацыйных умоў.

Пленум лічыць, што асобныя работнікі згубілі клясавую пільнасьць, не зразумелі таго, што ў калгасах толькі пачынаецца перавыхаваньне селяніна на данай стадыі калгаснага руху ў яго арцельнай форме, а не завяршаецца, ня ўлічылі наяўнасьці элемэнтаў клясавай барацьбы ў калгасах і не мабілізавалі мас калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкае сялянства для бязьлітаснага адпору кулацкім і рвацкім элемэнтам.

Выходзячы з гэтага аб'яднаны Пленум пастанаўляе:

1. Цалкам і поўнасьцю адобрыць пастанову Бюро ЦК КП(б)Б ад 23-X—31 г. аб загатоўках, якая (пастанова) з бальшавіцкай няпрымірлівасьцю ўдарыла па тых партыйных і савецкіх кіраўніках, якія адбіваючы дробна-буржуазныя сялянскія настроі дайшлі да права-опортуністычнага праціпастаўленьня спажывецкіх настрояў шэрагу калгасаў інтарэсам пролетарскай дзяржавы, якія ня здолелі арганізаваць масы на няўхільную барацьбу супроць буржуазных тэндэнцый у некаторых зьвеньнях дзяржаўных апаратаў (Белсельтрэст) і тым самым ня здолелі забясьпечыць поўнасьцю і ў тэрмін выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб загатоўках. У прыватнасьці, Пленум цалкам ухваляе пастанову Бюро ЦК аб зьняцьці з працы права-опортуністычнага кіраўніцтва Белсельтрэсту, раду райкомаў КП(б)Б, РВК, і райколгассаюзаў.

Пленум лічыць, што кіраўніцтва Калгасцэнтру дапусьціла правядзеньне ня правільнай лініі, якая не забясьпечвала выкананьне бальшавіцкімі тэмпамі загатовак па калгаснай сыстэме.

2. Цяпер у разгар загатоўчай кампаніі неабходна ўсямерна пасіліць рашучую барацьбу за свачасовае і поўнае выкананьне плянаў загатовак мобілізуючы для гэтай мэты ўсе сілы. Перад усімі партыйнымі, загатоўчымі, калгаснымі, саўгаснымі і іншымі грамадзкімі арганізацыямі стаіць задача баявога падвышэньня тэмпаў загатовак, асабліва ў галіне барацьбы за хлеб, бульбу, мяса, ільна-канаплі і экспартную продукцыю.

Пленум ставіць абавязкам перад усімі арганізацыямі неабходнасьць разгортваньня самай рашучай і пасьлядоўнай барацьбы са спажывецкімі, рвацкімі тэндэнцыямі ў колгасах, з буржуазнымі скажэньнямі лініі партыі ў некаторых зьвеньнях дзяржаўных апаратаў, патрабуе, каб кожны член партыі вёў шырокую растлумачальную масавую работу сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў аб іх абавязках у здачы (продажу) пролетарскай дзяржаве сельска гаспадарчай продукцыі. Рабочая кляса, ажыцьцяўляючы кіраўніцтва соцыялістычнай перабудовай вёскі, аказваючы аграмадную тэхнічную, фінансавую і інш. матэрыяльную і арганізацыйную дапамогу сялянству і асабліва калгасам, мае права патрэбаваць выкананьня колгасамі іх абавязкаў перад пролетарскай дзяржавай.

3. Пленум патрабуе, каб у бліжэйшыя дні быў створаны карэнны пералом у ходзе загатовак, шляхам абавязковай здачы саўгасамі вызначанай плянам загатовак прадукцыі не пазьней 10 сьнежня, шляхам рашучага пасіленьня работы па здачы (продажу) прадукцыі калгасамі і сыстэматычнай барацьбы супроць недаацэнкі індывідуальнага сэктару ў загатоўках, праводзячы гэтую работу з такім разьлікам, каб ва ўстаноўленыя тэрміны былі скончаны загатоўкі. Неабходна работу па ўзмацненьню тэмпаў загат вак правесьці такім чынам, каб саўгасы, колгасы і МТС зьяўляліся прыкладам для аднаасобнікаў сваёй датэрміновай здачай прадукцыі дзяржаве і былі сапраўднымі арганізатарамі ўсіх, памятуючы, што барацьба супроць спажывецкіх настрояў у калгасах за свачасовае і поўнае выкананьне імі сваіх абавязкаў перад дзяржавай, ёсьць барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгаснага будаўніцтва.

4. Пленум даручае Наркамснабу і ўсім райпарторганізацыям неадкладна прыняць захады да поўнага выкананьня плянаў загатовак і асабліва:

а) Па хлебу—разгарнуць рашучую барацьбу з ігнараваньнем таварнасьці збожжавых культур БССР, арганізаваць грамадзкі кантроль супроць разбазарваньня хлеба ў саўгасах і калгасах, вядучы бязьлітаснае змаганьне супроць памяншэньня валавога збору, за поўнае выяўленьне лішкаў збожжавых культур і першачаговую здачу дзяржаве па ўсіх абавязацельствах у прыватнасьці па кантрактацыі, прыняўшы тэрміновыя захады да вызваклі і забесьпячэньня хаваньня хлебных культур, якія знаходзяцца ў глубінных пунктах.

Пленум даручае ЦККРСІ і Наркамснабу пасіліць барацьбу супроць разбазарваньня памольнага збору, прыняўшы рашучыя меры, аж да прыцягненьня да партыйнай і судовай адказнасьці асоб вінаватых у гэтым.

б) па бульбе—у бліжэйшыя дні цалкам скончыць адгрузку бульбы для пролетарскіх цэнтраў Саюзу і пераключыцца па баявому на выкананьне плянаў загатовак для патрэб гарадоў БССР і прамысловасьці, раўнаючыся ў гэтай рабоце па перадавых раёнах здолеўшых правесьці бальшавіцкімі тэмпамі адгрузку бульбы пралетарскім цэнтрам СССР (Полацак, Пухавічы, Плешчаніцы, Касьцюковічы, Клімавічы, Мсьціслаў, Сяньно, Талочын, Бабруйск. р-ны);

в) па ільну-канаплі—арганізаваць першапачатковую апрацоўку ільну згодна дадзеных плянаў у колгасах і народ адзіначаснабіваў, прывесьці ў поўную гатоўнасьць загатоўчы апарат, праверыць выкананьне пляну завозу прамтавараў, пераструктураваць сельупаўнаважаных па загатоўках, дабіўшыся актыўнай работы загатоўчых апаратаў ня толькі ў арганізацыі загатовак, але і ў апрацоўцы ільну і канапель, звярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць здаваемай прадукцыі;

г) па мясу—патрабаваць ад загатоўчых органаў і партарганізацый разгортваньня барацьбы з недапушчальнай тэндэнцыяй выкананьня мясазагатовак выключна за лік буйнай рагатай жывёлы, пры зусім недастатковай загатоўцы сьвіней. Адначасова карэнным чынам павысіць тэмпы мясазагатовак. Разам з тым неабходна пасіліць барацьбу супроць разбазарваньня жывёлы, асабліва сярод аднаасобнікаў

д) По экспартнай прадукцыі—правесьці рашучае змаганьне з ігнараваньнем загатовак экспартнай прадукцыі, арганізоўваючы работу такім чынам, каб адначасова з асноўнымі відамі загатовак выконваліся пляны загатовак па экспартнай прадукцыі.

Пленум зьвяртае ўвагу партарганізацый на неабходнасьць дабіцца абавязковага палепшаньня якасьці здаваемай прадукцыі, разгортваючы ў гэтым напрамку рашучую барацьбу і разглядаючы здачу пядобраякаснай прадукцыі, як вынік кулацкага ўплыву. Таксама неабходна безадкладна і самым рашучым чынам палепшыць тэхніку прыёмкі, дабіваючыся ўважлівых адносін да здатчыка.

5. Пленум лічыць, што посьпехі выкананьня загатоўчых плянаў залежаць у большай ступені ад разгортваньня соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва мас (пры адначасовым прэм'яваньні лепшых здатчыкаў—колгасаў, саўгасаў і аднаасобнікаў), ад рашучай барацьбы супроць вядомай „тэорыі" чарговасьці кампаній, за свачасовае ў тэрмін выкананьне ўсіх відаў загатовак, асабліва з боку загатоўчых органаў. Пленум даручае ЦК РСІ праверыць сыстэму кіраўніцтва ў ўліку загатовак з боку адпаведных органаў, прыняўшы рашучыя меры ўзьдзейнічаньня ў адносінах элемэнтаў ня здольных па новаму кіраваць справай загатовак.

6. Пленум абавязвае ўсе партарганізацыі па-бальшавіцку ўзяцца за выкананьне пастаноў Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) „аб разгортваньні савецкага гандлю і палепшаньня снабжэньня рабочых" і даручае Наркамснабу, Белкаапсаюзу і ўсім райпарганізацыям выканаць дырэктыву партыі аб разгортваньні загатовак ЗРК, ЦРК, ЗВК і ТПО аб адчыненьні крам саўгасамі і калгасамі „пры абавязковай ўмове першапачарговай здачы (продажу) прадукцыі дзяржаве па цэнтралізаваных плянах" і аб распаўсюджваньні савецкіх базараў.

Пленум падкрэсьлівае, што ад свачасовага і поўнага выкананьня плянаў загатовак і ад максымальнай мабілізацыі ўнутраных харчовых рэсурсаў залежыць далейшае палепшаньне рабочага забесьпячэньня.

7. Пленум лічыць недапушчальным, што ў радзе раёнаў няма належнага зруху выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі і патрабуе неадкладнага пасіленьня гэтай работы, вядучы рашучую барацьбу з усімі кулацка-заможнымі элемэнтамі, ня выконваючымі гэтых заданьняў. Адначасова даручыць РК і РВК зараз жа выправіць перагібы, якія мелі месца ў радзе раёнаў пры правядзеньні практыкі цьвёрдых заданьняў (закраняньне серадняка), а таксама няпоўнае выяўленьне і недаабкладаньне кулака.

8. Пленум даручае партарганізацыям выкарыстаць кампанію перавыбараў парторганаў для пасіленьня справы загатовак актывізаваць у барацьбе за загатоўчы плян камсамол, працоўныя жанчыны, сельсаветы і іншыя грамадзкія арганізацыі з такім разьлікам, каб гадавы плян загатовак выканаць поўнасьцю і ў тэрмін,

Зьнішчыць перабоі ў рабоце транспарту

На Аршанскім вузлы паравозы на апалавай базе прастойваюць гадзінамі. За першую дэкаду лістапада мелася 34 выпадкі зрыву спаранай

„.. Пленум ЦК і ЦККК абавязвае дырэкцыі дарог, гаспадарчыя, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі раёну ў найкарацейшы тэрмін зьнішчыць усе адзначаныя недахопы ў правядзеньні спаранай язды, цьвёрда і рашуча правесьці ў жыцьцё загад тав. Андрэева" (З пастановы лістападаўскага пленуму ЦК і ЦККК КП(б)Б)

Ліквідаваць зрывы спаранай

Барацьба за ажыцьцяўленьне рашэньняў Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) і загаду Наркамшляху т. Андрэева не знайшла яшчэ рашучага водгуку на Аршанскім вузьле. Работа па возаму не пастаўлена ў цэнтры ўвагі. Асобныя зьвенні партыйнага і прафсаюзнага апарату не перабудавалі сваю работу на бальшавіцкае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду ў справе аздараўленьня транспарту.

Пазлікі па дэпо аб спаранай язьдзе паказваюць, што выкананьне за кастрычнік—94,7 проц. і за першую дэкаду лістапада—93,8 проц. Аднак, пры праверцы брыгадай выявілася другое: перазамацаваньне машыністаў і іх памоцнікаў і качагараў ня лічыцца за зрыў спаранай язды, а такія выпадкі падлічыліся. Трэба запытацца ці можа лічыць сябе гаспадаром паравозу машыніст перазамацаванага паравозу, калі ён зьяўляецца тут выпадковым госьцем. За кастрычнік было 28 выпадкаў перазамацаваньня, за першую дэкаду лістапада 23 выпадкі. Калі ўлічыць, што існуе практыка перазамацаваньня цэлых брыгад, дык зусім зразумела, што афіцыйныя лічбы аб спаранай не адпавядаюць сапраўднасьці. Такім чынам фактычна зрываў спаранай язды ў кастрычніку было 98, а ў першай дэкадзе лістапада было 34. Ёсьць выпадкі арганізацыі зборных брыгад, працуючых на асновах самай няпрыкрытай абязьлічкі.

Дзе-ж прычына незыкананьня спаранай язды?

Прычына ў тым, што загад т. Андрэева на асобных вучастках работы выконваецца фармальна. Для плянавай падачы паравозаў да пасажырскіх і таварных цягнікоў, для канчатковага замацаваньня спаранай язды складзены графік. Аднак, гэты графік парушаецца. Практыка выклікаў брыгад пастаўлена дрэнна. Ёсьць факты, калі паравозныя брыгады ня выклікаюцца з-за надбайных адносін дзяжурных нарадчыкаў. Гэта рэгіструецца як зрыў спаранай, але не паказваецца па чыёй віне гэта здарылася.

Гаспадарчы разьлік існуе на папер

5 сьнежня ўсе беларускі зьлёт ударнікаў фінансавага фронту

Фінансавы апарат, прафсаюзныя арганізацыі, прадпрыемствы, калгасы, вёскі і паасобныя ўдарнікі фінансавага фронту, рыхтуйцеся да зьлёту

Чэрвеньшчына ня выходзіць з палясы поарываў

Да ўсіх грамадзкіх арганізацый, фінансавага апарату і паасобных ударнікаў фінансавага фронту БССР

пройдзены этап баявой работы па мабілізацыі сродкаў з усёй яскравасьцю паказаў, што толькі шырока разгорнутая масавая работа, толькі актыўны ўдзел у барацьбе за выкананьне фінансавага плану самых шырокіх мас працоўных забясьпечваюць посьпехі на гэтым важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

Фінансавая эстафета ў радзе месяцаў выявіла работу па мабілізацыі сродкаў, выявіла значную колькасьць ударнікаў і перадавых актывістаў фінансавага фронту.

Як фініш фінансавай эстафеты 5 сьнежня г. г. у Менску будзе скліканы Ўсебеларускі зьлёт ударнікаў фінансавага фронту.

Каб падагуліць лепшыя формы і метады работы, падагуліць вынікі фінансавай эстафеты і ход выкананьня важнейшай фінансавай задачы сучаснага моманту—100 проц. выкананьня плану 4-га кварталу да 10-га сьнежня.

Фінансавы апарат, прафсаюзныя арганізацыі, паасобныя прадпрыемствы, калгасы, вёскі і паасобныя ўдарнікі фінансавага фронту рыхтуйцеся да зьлёту. За гэты кароткі да зьлёту час шырэй разгортвайце фінансавую эстафету, дабівайцеся найлепшых паказчыкаў ва ўсіх вучастках пляну мабілізацыі сродкаў. Ліквідуйце, якія ёсьць на паасобных вучастках гныя прарывы. Баявым маршам падыходзьце да фінішу фінансавай эстафеты—Усебеларускага зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту. Рыхтуйцеся да рапарту праз вашых дэлегатаў зьлёту ад дасягненьняў вашых раёнаў, гарадоў, сельсаветаў, паасобных прадпрыемстваў, калгасаў і вёсак па важнейшым вучастку—на фронце мабілізацыі сродкаў на справу сацыялістычнага будаўніцтва.

Рапартуйце Ўсебеларускаму зьлёту ўдарнікаў аб мерапрыемствах забясьпечваючых выкананьне і перавыкананьне пляну 4-га кварталу.

Старшыня штабу па правядзеньні фінансавай эстафеты
Калнін.

Нам. Народнага Камісара Фінансаў БССР
Ляхаў.

Нам. старшыні праўленьня прафсаюзу ФБР
Пархоменка.

Фінансавая эстафета работнікі Мінілеўшчыны ня ўключылася ў фінішу

У Магілеўскім раёне фінплян за кастрычнік месяц выкананы на 80 проц., а плян 4-га кварталу выкананы на 32 проц.

У чым прычына недавыкананьня фінпляну? Перш за ўсё, што райштаб па правядзеньні фінэстафеты бязьдзейнічае. Яшчэ і да гэтага часу не праяваліся даручэньні даныя фінармейцам, не выпраўляліся недахопы, меўшыя месца ў іх рабоце. Пасылка брыгадзіраў на вёску праводзілася з наскоку без папярэдняга іх інструктаваньня і канкрэтных абавязацельстваў, а таму мелася выпадкі, калі брыгадзіры ня ведалі, што ім рабіць і выконвалі зусім іншыя работы.

Трэба падкрэсьліць асабліва недапушчальна - агідныя адносіны і поўную бязьдзейнасьць у правядзеньні фінэстафеты фінбанкаўскіх работнікаў, якія замест таго, каб быць перадавікамі і змагарамі за посьпехі фінэстафеты, засталіся ў баку ад гэтага важнейшага вучастку работы. Большасьць фінбанкаўскіх работнікаў не хадзілі на прадпрыемствы для арганізацыі работы, спасылаючыся на розныя аб'ектыўныя прычыны: «няма часу», «далёка хадзіць» і г. д. Вось галяряя гэтых тыпаў, лодыраў і сымулянтаў: **Тыч, Бэрман, Чавусаў, Баярскі, Рамановіч, Зяньковіч, Кажамякіна, Зільбэрман, Майкова і Рыўкіна.**

Райштаб зусім запамятаваў аб правядзеньні работы на вёсцы, аб перакідцы туды асноўнай сілы. Шмат якія сельсаветы яшчэ ня ведаюць пра фінэстафету яе праграма не даведзена да калгасных і бядняцка - серадняцкіх мас.

Такое становішча з правядзеньнем фінэстафеты надалей нецярпіма. Раённыя арганізацыі павінны зараз-жа без адкладна пераключыцца на правядзеньне фінэстафеты, забясьпечыўшы пасьпяховае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў 4 кварталу.

Д. Алан.

Стаўка на самацёк, апартунізм—вось, што зрывае выкананьне фінпляну на Чэрвеньшчыне

ЧЭРВЕНЬ. 23-XI. Плян мабілізацыі сродкаў па Чэрвеньскім раёне зрываўся з квартала ў квартал, бо райфа і другія раённыя арганізацыі гэтай кампаніі не надавалі належнай увагі, ня былі мабілізаваны працоўныя масы на гэты адказны вучастак работы.

На працягу 3-х кварталаў раён у выкананьні плянаў мабілізацыі сродкаў мае ганебныя прарывы. Так, за першы квартал агульны плян мабілізацыі сродкаў выкананы толькі на 61 проц.

За другі — 77 проц., за трэці—62,2 проц. і нарэшце за чацьверты квартал на 20 лістапада выкананы плян толькі на 32,4 проц.

Па зборы сельгаспадатку агульны плян выкананы на 76,9 проц., па страхоўцы на 83,7 проц., па самаабкладаньні — 20 проц., па рэалізацыі пазыкі — на 35,2 проц., па акцыях Трактарацэнтру— на 12 проц., па абавязацельствах па сельгаспадарчыя машыны — на 7 проц., па паявых па райспажыўсаюзу на 7,1 проц., па лясной каапэрацыі — на 4,2 проц. Амаль гэтакае-ж становішча і па другіх паказчыках.

Недаацэнка мабілізацыі сродкаў з боку кіруючых арганізацый, адсутнасьць чоткага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку райфа, абязьлічка ў выкананьні пляну ў радзе раённых арганізацый прывялі да поўнага зрыву пляну апошняга заключнага кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Да гэтага часу раённыя арганізацыі не зрабілі належнага нажыму на кулацка - заможныя гаспадаркі па спагнаньні абавязковых плацяжоў. У выніку чаго з кулацка - заможных гаспадарак яшчэ не спагнана больш чым на палову сельска - гаспадарчага падатку страхоўкі і г. д.

Трэба адзначыць, што па ўсіх галінах выкананьня фінансавага пляну ня ма сталага вучоту, таму раённыя арганізацыі ня ведаюць, якое становішча з выкананьнем фінпляну па сельсаветах. Бываюць выпадкі, што раённыя працаўнікі едуць у тыя сельсаветы дзе справа з мабілізацыяй сродкаў пастаўлена добра, а там, дзе гэтая справа наладжана горша туды ніхто не заглядае. Усё гэта гаворыць аб тым, што раённыя арганізацыі і ў першую чаргу Райбюро нядбайна адносяцца да спразы мабілізацыі сродкаў.

Раён уключыўся ў фінэстафету. На нарадзе фінбанкаўскіх работнікаў быў арганізаваны райштаб па правядзеньні фінэстафеты, але-ж да гэтага часу штаб не зрабіў ні аднаго паседжаньня Райфа па правядзеньні фінэстафеты напісала толькі адну адносіну сельсаветам, у якой пішацца: «Гэтымі днямі адбудзецца фінансавая эстафета, працаўнікі раёну дапамогуць у рабоце, але папярэдня трэба жорстка і безадкладна сваімі сіламі сельсавету штурмаваць грашовы прарыў». У гэтай-жа самай адносіне райфа па сэнсу тлумачэньня дае дазвол сельсаветам не здаваць сабраныя грошы ў райбанк, а выдаткоўваць на патрэбы сельсаветаў на мясцох. Вось прынцып спагнаньня грашовых сродкаў і мэта згодна сьць іх скарыстаньня.

Паасобныя работнікі раёну да справы мабілізацыі сродкаў адносяцца нядбайна. Сярод работнікаў раёну існуюць такія разважаньні: «магу пра цаваць і магу зрабіць значна больш, але не хачу». Гэтак заяўляе інспектар райфа **Андруковіч.** Па такіх шкодных апартуністычных настроях ня ўдарыла рашуча ні ячэйка КП(б)Б, ні раённы камітэт фінбанкаўскіх работнікаў, якія аб гэтай справе добра ведаюць.

За зрыў фінпляну Чэрвеньскаму раёну **рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» уручыла рагожны сьцяг,** але раён да гэтага часу яшчэ ня ўзяў належных тэмпаў у рабоце, якія-б забясьпечылі пасьпяховае выкананьне фінпляну.

Раённыя арганізацыі павінны неадкладна пераключыць усе сілы, усю энэргію на выкананьне фінпляну з тым, каб да 10 сьнежня плян мабілізацыі сродкаў па раёне быў выкананы поўнасьцю. **Толькі пры гэтай умове раён зможа зьняць з сябе рагожны сьцяг.**

Брыгада «Сав. Бел.» і Наркамфіну:
І. Паўлоўскі, Б. Спарыхін
і С. Юрэвіч.

Вушаччына ганебна адстае

ВУШАЧЫ. Мабілізацыя сродкаў у чацьвертым квартале па раёне ідзе марудна. Квартальнае заданьне па с-г падатку выканана на 28,3 проц., па страхоўцы—на 34,8 проц.

У пагражаючым становішчы знаходзіцца выкананьне пляну ў галіне рэалізацыі пазыкі «Трэцяга рашаючага», рэалізацыі машынных абавязацельстваў і акцый Трактарацэнтру. Плян па рэалізацыі пазыкі «3-цяга рашаючага» па раёне выкананы толькі на 15,4 проц.; па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру—на 0,5 проц. і па рэалізацыі машынных абавязацельстваў—на 2,5 проц.

Лепш абстаіць справа з мабілізацыяй сродкаў па райсаюзе і па ашчад касе, дзе плян выкананы да 85 проц.

Гэткае становішча нельга інакш кваліфікаваць як апартуністычнай недаацэнкай мабілізацыі сродкаў. Трэба РК КП(б)Б рашуча ўдарыць па тых, хто зрывае поўнае выкананьне фінпляну і мабілізаваць усю грамадзкасьць на сваячасовае выкананьне яго.

Кароль.

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

пра ход будаўніцтва Гомельскага шкляного заводу

Выслухаўшы даклады начальніка работ па будаўніцтву Гомельскага шкляного заводу тав. Емельянава і Дырэктара заводу тав. Амера, паведамленьне прадстаўніка аб'яднаньня «Саюзшклофарфар» тав. Кузьнецова аб становішчы будаўніцтва заводу, садклад Сакратара Камісіі Выкананьня пры СНК БССР тав. Элькіна аб выніках праверк ходу будаўніцтва Гомельскага шкляного заводу, Камісія Выкананьня пры СНК БССР адзначае зусім марудныя тэмпы будаўніцтва і прызнае становішча работы па будаўніцтву і падрыхтоўцы заводу да пуску нездавальняючым.

Камісія Выкананьня ўстанаўляе, што:

а) пастановы ЦК КП(б)Б і ўраду БССР аб пуску 1-й сыстэмы заводу да 1 студзеня 1932 г. не знайшлі належнага адбітку ў арганізацыі і тэмпах будаўнічых работ мерапрыемствах, зьвязаных з пускам заводу (разьмяшчэньне абсталяваньня, падрыхтоўка кадраў і інш.);

б) кіраўніцтва Саюзшклофарфару сваёю пастановаю за 19 верасьня 31 г., не ўзгодніўшы гэтага пытаньня з урадам БССР, адтэрмінавала пуск 1-й сыстэмы да 1-га красавіка 1932 г., на падставе чаго заканчэньне будаўніцтва асобных аб'ектаў адпаведна перанесе на на больш позьнія тэрміны, як прадугледжана плянам;

в) Начальнік работ тав. Емельянаў і дырэктар заводу тав. Амер ня ўжылі захадаў да фарсыраваньня тэмпаў будаўніцтва. У будаўнічых работах ня было мэтазгай устаноўкі на сваячасовае пабудаваньне аб'ектаў, патрэбных для пуску заводу у выніку чаго ў першую чаргу пабудаван рад другарадных будоў у той час, як асноўныя аб'екты (газагенэратарная станцыя, ваннае адзяленьне і інш.) будуюцца са значным спазьненьнем;

г) гаспадарчае, партыйнае і прафсыяльнае кіраўніцтва Гомшклобуду не мабілізавала ўвагі рабочых і інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу будаўніцтва вакол задачы сваячасовага заканчэньня будаўніцтва заводу, не разгарнула сацыялістычных мэтадаў працы за ўдарныя тэмпы будаўніцтва;

д) Кіраўніцтва Гомшклобуду ня выканала пастановы ЦК КП(б)Б пра перавод будаўнічых работ на прэм'яльна - прагрэсыўную аплату. Да гэтага часу на будаўніцтве існуе арцельная аплата працы пініях канкрэтных мерапрыемстваў для пераходу на прэм'яльна - прагрэсыўную аплату ня робіцца;

е) дырэктар заводу тав. Амер ня ўжыў усіх патрэбных захадаў да належнай падрыхтоўкі кадраў кваліфікаваных рабочай сілы і правільнай расстаноўкі рабочых і інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу да часу пуску заводу;

ж) Саюзшклофарфар, Кіраўніцтва Гомшклобуду і ВСНГ БССР ня ўжылі усіх патрэбных захадаў да выкананьня дырэктывы ЦК КП(б)Б аб забясьпечаньні будаўніцтва заводу дэфіцытнымі і мясцовымі будаўнічымі матар'яламі.

У паасобку ВСНГ, у асобе т. Гольдштэйна і Бравермана, сваімі распараджэньнямі аб перадачы ў парадку абмену для будаваньня Гомельскага Мэханічнага Інстытуту 1.200 тыс цэглы за лік Гомшклобуду ў разгар будаўнічага сэзону, а таксама Дзяржплян, у асобе тав. Штыфмана, паасобнымі выдачамі за лік Гомшклобуду, пагоршылі забясьпечаньне будаўніцтва цэглай;

з) Гомельскі «Вадасьвет», у асобе тав. Зьвягельскага, ня выканаў дадзеных яму дырэктыў аб правядзеньні мерапрыемстваў, патрэбных для забясьпечаньня шкляного заводу электраэнэргіяю;

і) забясьпечаньне рабочых будаўніцтва з прычыны няўважлівых адносін да гэтай справы кіраўнікоў Гомшклобуду і кіраўніцтва ЗРК, пастаўлена вельмі дрэнна.

Якасьць абедаў у сталоўцы зусім не здавальняючая, няма патрэбнага інвэнтару (лыжак, нажоў і г. д.), не праведзен санітарны мінімум.

ЗРК не праявіў ініцыятывы па разгортваньні самастойных загатовак бульбы, гародніны і іншых прадуктаў і па правядзеньні мерапрыемстваў для палепшаньня забясьпечаньня рабочых (арганізацыя сьвінарнікаў і інш.).

Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Адзначаючы фактычны зрыў па паказаных прычынах тэрміну пуску заводу, устаноўленага ЦК КП(б)Б і ўрадам БССР, устанавіць канчатковы тэрмін пуску заводу не пазьней 1 красавіка 1932 г.

2. Прапанаваць начальніку работ Гомшклобуду тав. Емельянаву і дырэктару заводу тав. Амеру ўсімі спосабамі фарсыраваць будаўнічыя работы, асабліва па асноўных аб'ектах, якія маюць рашаючае значэньне для пуску заводу, мабілізаваўшы вакол задачы хутчэйшага пуску заводу ўсіх рабочых і інжынэрна тэхнічны пэрсанал будаўніцтва, дабіўшыся ўдарных тэмпаў працы праз шырокае разгорваньне шкляного заводу будаўнічымі матар'яламі:

а) прасіць ВСНГ СССР вылучыць адпаведныя фонды дэфіцытных матар'ялаў для сваячасовага заканчэньня будаўніцтва (цэмэнт, жалезна гатункове, бальк., трубы, рэйкі) даць паказаньне не належным арганізацыям аб адгрузцы гэтых матар'ялаў у лістападзе і сьнежні г. г. Прапанаваць Кіраўніцтву Гомшклобуду рэалізаваць у самы кароткі тэрмін атрыманыя нарады,

б) прапанаваць ВСНГ БССР у пяцідзённы тэрмін праверыць патрэбы Гомшклобуду ў круглым лесе і разам з Саюзшклофарфарам забясьпечыць вылучэньне адпаведных фондаў.

Бяручы пад увагу недахоп піламатар'ялаў, лічыць патрэбных замяніць частку піламатар'ялаў круглым лесам. Абавязаць Кіраўніцтва Гомшклобуду перавесьці работу лесапілкі, якая ёсьць на будаўніцтве, на тры зьмены;

в) даручыць асобнаўпаўнаважанаму СНК па разьмеркаваньні будаўнічых матар'ялаў тав. Гурэвічу разглядзець заяўку Гомшклобуду на дадатковую выдачу цэглы ў IV квартале для поўнага заканчэньня будаўніцтва;

г) даручыць Нам. Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Шляхаў пры СНК БССР тав. Эгле і Дняпроўскабясьпечыць неадкладную падачу вагону, пад адказнасьць тав. Яршова, задзьвінскаму Кіраўніцтву рачнога флёгонаў на ст. Магілеў, Віцебск, Сураж (Заходняй вобласьці) і патрэбнай колькасьці барж на пристань Прапойск для перавозкі занаражанага і закупленага Гомшклобудам цэгла.

4. Прасіць Кіраўніцтва Саюзшклофарфару неадкладна выслаць Гомшклобуду нехапаючыя рабочыя рысункі, а таксама і каштарасы па ўсіх аб'ектах.

5. Абавязаць Кіраўніцтва Гомшклобуду, пад адказнасьць тав. Емельянава і Амера, на працягу 2-х дэкад перавесьці будаўнічыя работы на прэм'яльна прагрэсыўную аплату, адпаведным чынам падрыхтаваўшы гэтае мерапрыемства.

6. Прасіць ВСНГ СССР максымальна скараціць тэрмін вырабу дастаўкі абсталяваньня і поўнасьцю забясьпечыць Гомельскі завод патрэбным абсталяваньнем для пуску першай сыстэмы ў вызначаны тэрмін, а таксама агнятрывалым прыпасам.

7. Даручыць ВСНГ БССР устанавіць максымальную колькасьць прыпасу, якую магчыма выпрацаваць на шкляных заводах БССР, і абавязаць Белшклоаб'яднаньне, пад адказнасьць т. Кроля, забясьпечыць выраб гэтай колькасьці прыпасу, заключыўшы адпаведны дагавор з Гомшклобудам.

Абавязаць тав. Амера (Шклобуд) не адкладна пусьціць ганчарку і пачаць выраб прыпасаў.

8. Прасіць ВСНГ СССР прапанаваць электрапрому не пазьней 1 студзеня 1932 г. адгрузіць заказанае абсталяваньне для мантажу панізіцельнай падстанцыі Гомшклобуду.

9. Прапанаваць тав. Шаршнёву (Беэнэрга) ужыць захады да забясьпечаньня патрэбным абсталяваньнем (провад кранштэйны, залятар) лініі перадачы Гомель—Касьцюкоўка.

10. Абавязаць: а) тав. Емельянава (Шклобуд), на працягу лістапада закончыць будаўніцтва панізіцельнай падстанцыі і б) тав. Зьвягельскага (Вадасьвет) скончыць абсталяваньне лініі перадачы і мантаж панізіцельнай падстанцыі Шклобуду не пазьней 1 лютага 1932 г.

11. Прапанаваць Белторгпаў'яднаньню загатоўку торпу для Гомшклозаводу весьці на бліжэйшым да заводу вучастку торпазаводу «Бальшанка».

Абавязаць дырэктара шкляного заводу т. Амера зараз-жа правесьці падрыхтоўчую работу для вывазкі на працягу 4-х месяцаў (сьнежань-сакавік) на тэрыторыю шкляного заводу патрэбнай па першы пэрыяд работы заводу колькасьці торпу (ня менш 10 тыс тон).

12. Прапанаваць т. Амеру сваячасова правесьці ўсе мерапрыемствы па падрыхтоўцы кадраў для заводу (адбор і перакваліфікацыя рабочых, укамплектаваньне апарату заводакіраўніцтва, правільная расстаноўка рабочых і інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу) з тым, каб да тэрміну пуску заводу цалкам забясьпечыць апошні належнымі кадрамі.

13. Прасіць Кіраўніцтва Саюзшклофарфару:

а) сваячасова забясьпечыць шкляны завод усімі патрэбнымі для вытворчасьці матар'яламі (сода, сульфат і інш.);

б) забясьпечыць заводакіраўніцтва адпаведнымі кадрамі інжынэрна - тэхнічных работнікаў.

14. Ускласьці на дырэктара заводу ЗРК адказнасьць за неадкладнае правядзеньне мерапрыемстваў па палепшаньню снабжэньня рабочых (разгорваньне самастойных загатовак, арганізацыя сьвінарнікаў, палепшаньне работ сталовых і інш.).

Прапанаваць Белкаапхарчу пад адказнасьць тав. Аськіна зараз-жа забясьпечыць сталоўку Гомшклобуду патрэбным інвэнтаром.

15. Зьвярнуць увагу Гомельскага Гарадзкога Прафсавету на неабходнасьць неадкладнага ўзмацненьня прафкіраўніцтва на Гомшклобудзе.

Прапанаваць Гомельскаму Гарадзкому Савету праводзіць сыстэматычны кантроль за будаўніцтвам шкляного заводу, робячы апошняму ўсялякую дапамогу.

16. Даручыць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня неадкладна праверыць адпаведае фактычная колькасьць рабочых на будаўніцтве вылучаных на IV квартал фондам і прыцягнуць да адказнасьці асоб, вінаватых у дачы дутых заявак.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня
А. Калнін.

Сакратар Камісіі Выкананьня
Я. Элькін.

15 лістапада 1931 г. г. Менск.

Лист у рэдакцыю

У № 270 газэты «Савецкая Беларусь» за 23 лістапада г.г. зьмешчаны пад назвай «На верным шляху» артыкул за маім подпісам. Даводжу да ведама, што ніякага артыкулу для надрукаваньня ў газэце «Савецкая Беларусь» я не даваў.

У гэтым артыкуле, без майго ведама і дазволу, выкарыстаны некаторыя матар'ялы да майго артыкулу «Становішча і чарговыя задачы II Беларускага Дзяржаўнага тэатру», які быў здан у газэту «Зьвязда».

Матар'ял гэты выкарыстаны невядомым для мяне аўтарам надзвычайна груба і няпісьменна і зьмешчаны ў няверным апрацоўцы.

Адзначаючы, што артыкул «На верным шляху» ня мой і здымаючы з-пад яго свой подпіс, я рашуча і катэгарычна пратэстую супроць гэтакіх здарэньняў на старонках газэты «Савецкая Беларусь».

В. Вольскі.

Ад рэдакцыі: Артыкул «На верным шляху», зьмешчаны ў № 270 нашай газэты, зьяўляецца, сапраўды, няўдалым выкарыстаньнем матар'ялаў тав. Вольскага да яго артыкулу «Становішча і чарговыя задачы II Беларускага Дзяржаўнага тэатру», напісаным для «Зьвязды».

Зьмяшчэньне ў такім выглядзе артыкулу на старонках «Савецкай Беларусі», як і надрукаваньне пад ім прозьвішча тав. Вольскага, рэдакцыя лічыць памылковым. Канкрэтны вінавай на супрацоўнік рэдакцыі Мядзьведзеў прыцягнут да адказнасьці.

Аказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ

Паста ова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Белаоускай ССР

пра ўзнагароды лучэк то ых работнікаў міліцыі

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, у адзнаку XIV-й гадавіны Рабоча-Сялянскай Міліцыі БССР, пастанаўляе ўзнагародзіць Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу БССР наступных работнікаў міліцыі:

1. тав. Гольдберга, Ісака Навумавіча, за актыўны ўдзел у барацьбе з бандытызмам і злачыннасьцю за час яго работы ў органах міліцыі 1920 году.

2. тав. Пятрова, Цімафея Максімавіча, які сябе праявіў як адданы і добрасумленны работнік за ўвесь час работы ў органах міліцыі з 1921 году і за актыўны ўдзел у барацьбе з бандытызмам.

3. тав. Скібінскага, Міхася Кастусёвага, былога чырвонагвардзейца-партызана за адважную і прыкладную работу за час прабываньня ў органах міліцыі з 1921 году і за актыўны ўдзел у барацьбе з бандытызмам і злачыннасьцю.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гілякевіч.

12 лістапада 1931 г.

Першая Конфэрэнцыя Менскай Аб'яднаньні Пролетарскіх Пісьменнікаў

адбудзецца 25—29 лістапада г. г.

Парадак працы: 1. Чацьверты год пяцігодкі і задачы пролетарскай літаратуры (даклад сакратара ЦК КП(б)Б т. Шаранговіча); 2. Сучаснае становішча беларускай літаратуры і задачы МенАПП (даклад т. Бэндэ); 3. Першыя вынікі закліку рабочых - ударнікаў у літаратуру (даклад сакратара МЕНАПП т. Александровіча); 4. Паказ гэрояў пяцігодкі ў беларускай пролетарскай лутаратуры (даклад т. Кучара). 5. Выбары. Па асноўных пытаньнях адбудуцца садклады яўрэйскай і польскай сэкцый МенАПП і садклады аб творчасьці рабочых ударнікаў.

Учарыстае адчыненьне канфэрэнцыі адбудзецца ў вялікай залі Дому Камасьветы (вул. К. Маркса) 25 лістапада а 6-й гадзіне ўвечары.

Фракцыя а 5-й гадзіне ў Доме Комасьветы.

Уваход на ўрачыстае адчыненьне па запрашальных білетах.

Выдача мандатаў дэлегатам канфэрэнцыі ў Д. Пісьменьніка кожны дзень з 2 да 4 гадз дня.

Арганізацыйны Камітэт па скліканьню канфэрэнцыі.

За сацыялістычную рэконструкцыю комунальнай гаспадаркі

ПА ПЛЯНУ КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ

Чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б) адным з першачарговых задач нашага сацыялістычнага будаўніцтва на даным этапе паставіў задачу разьвіцьця камунальнай гаспадаркі.

За апошнія гады як па ўсім Саюзе, таксама і па БССР у гарадзкую гаспадарку ўкладаецца шмат сродкаў. Мы ня толькі аднавілі гарадзкую гаспадарку разбураную за час імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны, але па радзе буйных прамысловых цэнтраў далёка пакінулі за сабой даваенны ўзровень.

Але ня гледзячы на гэтае разьвіцьцё камунальная гаспадарка ў нас рэзка адстае ад усяго нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

З чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) прайшло ўжо пяць месяцаў.

Для праверкі зробленага гарадамі для выкананьня рашэньняў партыі і ўраду ў галіне разьвіцьця гарадзкой гаспадаркі, ў мэтах абмену вопытам перадавых гарсаветаў у гэтай справе і падцягненьня адстаючых гарадоў — ЦВК СССР рашыў правесьці агляд камунальнай гаспадаркі па некалькіх Саюзных рэспубліках. БССР, РСФСР, УССР, ЗСФСР пачынаюць агляд гэтымі днямі.

ЦВК БССР праводзіць абсьледваньне камунальнай гаспадаркі з 20 лістапада па 5 сьнежня. Абсьледваньне будзе праведзена па 3-х самастойных гарсаветах—Менскім, Віцебскім, Гомельскім і па 3-х гарсаветах падначаленых РВК—Бабруйскім, Барысаўскім і Полацкім.

Правесьці гэтае абсьледваньне, каб яно дало належныя вынікі, сапраўды асьвятліла становішча гаспадаркі кожнага гарсавету, спрыяла-б абмену вопытам паміж гарсаветамі і зрабіла-б зрух ва ўсёй справе камгасу, — магчыма пры актыўным удзеле ў гэтай справе шырокіх мас рабочых, усяго савецкага актыву, дэпутацкіх груп і сэкцый гарсаветаў.

ЦВК БССР праводзіць агляд шляхам абмену брыгад паміж гарадамі. Так, Віцебск павінен паслаць сваю брыгаду ў Гомель, Бабруйск—у Барысаў і наадварот.

Самаспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў саветаў», якое шырока разгарнулася па БССР, павінна садзейнічаць разьвіцьцю камунальнай гаспадаркі. Агляд камунальнай гаспадаркі павінен выявіць гарсаветы, якія шырока разгарнулі барацьбу за выкананьне перавыкананьне праграмы - мінімум, высунутай газэтай «Савецкая Беларусь» у парадку самаспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе».

Справа разьвіцьця гарадзкой гаспадаркі мае вялізарнейшае значэньне.

М. Хаванскі.

МЕНСКІ АБКАМТРЭСТ

павінен зараз-жа перайсьці на новыя формы работы

Дырэктывы партыі і ўраду аб палепшаньні камунальнага абслугоўваньня насельніцтва гарадоў злачынна ня выконваюцца Менскім Абкамтрэстам.

Прамфінплян па прадпрыемствах трэсту праваліў: па мэханічнай пральні прамфінплян выкананы толькі на 50,2 проц., па лазьні № 1—на 81 проц., па лазьні № 4— на 67.1 проц., па лазьні № 3—на 85,7 проц.

Дырэктар Абкамтрэсту тав. Агол спасылаецца на аб'ектыўныя прычыны (перабоі ў забясьпячэньні апалам, мылам, содай ды інш.). Між тым пры добрым кіраўніцтве і правільнай пастаноўцы работы на прадпрыемствах магчыма было-б гэтыя недахопы ліквідаваць.

Кіраўніцтва з боку Трэсту камунальнымі прадпрыемствамі вельмі слабое. На ўсіх прадпрыемствах пануюць абязьлічка, ураўнілаўка і поўная безадказнасьць.

Рамонт гасьцініц і лазьняў, які вядзецца Менбудам —ідзе надзвычайна марудна. Абкамтрэст ходам работ ня цікавіцца і іх не кантралюе.

Маецца шмат выпадкаў прастояў лазьняў: 4 лазьні з пачатку году прастаялі ў цэлым каля 400 дзён, г. зн.—адна лазьня не працавала больш году.

Гаспадарчы разьлік уведзен па ўсіх прадпрыемствах, але належнага вучоту і падліку эфэктыўнасьці работы не вядзецца.

Вугочны апарат Абкамтрэсту і прадпрыемстваў адстае ў рабоце на 5-6 месяцаў. Расход апалу ідзе самым агідным чынам: вучоту прыходу і расходу дроў па прадпрыемствах не вядзецца, што дазваляе ў некаторых выпадках разбазарваць дровы.

Ёсьць факты, калі дровы прыбыўшы ў адрас Трэсту ня выгружаліся або выгружаныя ляжалі на станцыі 12 і больш дзён і Трэст, ня гледзячы на востры недахоп у іх, ніякіх мер для тэрміновай перавозкі ня прымаў. Для аховы дроў былі пастаўлены ваўтаўнікі, але дровы раскрадаліся.

Затрымка ў перавозцы апалу з боку Абкамтрэсту дала магчымасьць фабрыцы „Камунарка" забраць сябе два вагоны трэстаўскіх дроў. Трэст ня ведаў аб гэтым, а калі даведаўся, дык маўчаў.

Абкамтрэст падпарадкаваны Менкамгасу, але кіраўніцтва і кантроль з боку апошняга адсутнічаць.

Сацыялістычныя формы работы на прадпрыемствах і ва ўсім апараце Трэсту ня ўжываюцца. Культурна-масавая работа сярод рабочых і служачых у поўным заняпадзе. Маючыся пры Трэсьце ленкуток заўсёды на замку; аб яго існаваньні рабочыя масы ня ведаюць. Ячэйка КП(б)Б і мясцком Абкамтрэсту таксама як і Гарком саюзу Камунальнікаў добра ведаюць аб агідным становішчы прадпрыемстваў Трэсту але ніякіх мер для палепшаньня гэтага становішча ня прымаюць.

МенгарКК РСІ і ЦП саюзу Камунальнікаў павінны абсьледваць становішча Трэсту і яго прадпрыемстваў, выявіць канкрэтных віноўнікаў зрыву прамфінпляну і прыцягнуць іх да адказнасьці.

А. Росьлік.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА
Пачатак а 6, 8 20; 10-30 кр. а 4 г.
Гук. фільм
Златыя горы
ў 8 частках

КІНО-ТЭАТ КУЛЬТУРА
Пач. а 7 8 45, 10-30. Каса ад 5 г.
Замежны фільм
У сьвеце пянэт і зорак
Звыш праграмы Часопіс Саюзкіно № 63

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
Пач. 3-30, 6, 7-30, 9 і 10-30 каса ад 12 г.
Гасьцінны фільм
Нявольнікі бледнай гары
Звыш праграмы кінанавіны АПОШНІ ШЛЯХ (па аповесьці Кінчэскага)

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
Пачатак а 2 гадз
Мастацкі баявік
Гандляры слізкіх

Хімічнаму броварну
ПАТРАБУЕЦЦА
ВОПЫТНЫ ШОФЭР
са стажам
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ
Будуць заданы камунальныя паслугі.
Жадаючых прозьвіцца асабіста, або пакідаць цідзіны у паштовае Жуковічы Хатаўнянскаму броварну завода кіраўніцтву.

КОШТ 1 р.
продаецца АБ ЗГУБЕНАГО ДАКУМЕНТУ

З 25-XI да 25-XII 1931 г.
АДБЫВАЕЦЦА ПРЫЁМ ЗАЯЎ
У ІНСТЫТУТ АРХІВАЗНАЎСТВА ў Маскве
ЗАДАЧА ІНСТЫТУТУ:
падрыхтоўка кваліфікаваных працаўнікоў з марксыцка ленінскай мэтадалёгіі, добра знаёмых з гісторыяй народаў СССР і Захаду, архіўнай справай, для арганізацыйна кіраўнічай і навуковай працы над гістарычнымі дакумантамі ў архіўных установах СССР.
Тэрмін навучаньня: на асноўным аддзяленьні— 2 гады, у падрыхтоўчым—1 год.
У інстытут прымаюцца асобы з закончанай сярэдняй адукацыяй, у першую чаргу члены УсеКП(б) і члены ЛКСМ. З беспартыйных перавага даецца рабочым, батракам, беднякам, хадзеям і асобам з ім аналагічным соцпраўным стажам.
На падрыхтоўчае аддзяленьне прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 7 кл.
Заявы накіраваць у Інстытут Архіўнае Кіраўніцтва БССР—Менск, вул. Бакуніна, 4, або ў адпаведныя Цэнтральнага Архіўнага Кіраўніцтва БССР: Віцебск, Ленінскі пр., д. 4, Магілеў—Першамайскі зав., д. 4, Гомель—Інвалідная, Пролетарскі зав., д. 13.
Кім ж. Ніжэйшыя ... ...
Цэнтральнае Архіўнае Кіраўніцтва БССР.

Беларускі Рэспубліканскі Інстытут
завочнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі с.-г. кадраў пры НКЗБ
І МАЛАДЗЁЖНЫ ІНСТЫТУТ ЦК ЛКСМБ
абвяшчаюць, што пры с.-г. ВНУ і тэхнікумах БССР
АДЧЫНЕНЫ ЗАВОЧНЫЯ СЭ ТАРЫ,
якія праводзяць падрыхтоўку і перападрыхтоўку с.-г. кадраў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі і майстраў-брыгадзіраў.
Спіс завочных сакторыяў і спэцыяльнасьцей, умовы прыёму, форма анкеты—тэрміны, навучальныя планы, мэтады навучаньня і інш. пытаньні ў прыёмнай Рэспубліканскага Інстытуту, які знаходзіцца на ўсе райсаветы і іншыя арганізацыі БССР, саўгасы, калгасы, МТС.
Праспэкт і даведкі можна атрымаць у Рэспубліканскім Інстытуце— Менск, Савецкая, 71.
Дырэктар Рэспубліканскага Інстытуту ШУМЕЙКА

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ
даводз